# Важная справа

Трэці год падпіска на «Нашу Ніву» і іншыя незалежныя газэты адбываецца ў нязвыклай форме. Газэта трымаецца, бо Вы захоўваеце вернасьць ёй і дзейнічаеце як вольныя грамадзяне. На самой справе, Вы сталі сутворцамі нечага беспараўнанага ў Беларусі і незвычайна важнага для духу ўсёй эўрапейскай супольнасьці. Два гады выходзяць газэты, забароненыя да распаўсюду. Такога ня выкрасьліш з гісторыі. Грамадзтва паказвае, хто галоўны: грамадзяне ці ўлада.

Просім працягнуць падпіску. Болей: мала проста вам асабіста застацца з газэтай, каб яна выстаяла, трэба яшчэ ўвесь час прыцягваць новых людзей. Мы езьдзім па краіне, сустракаемся зь людзьмі, робім, што можам. Ад вас просім, каб КОЖНЫ З ВАС расказаў пра «Нашу Ніву» ў сваёй сяброўскай, працоўнай, царкоўнай, партыйнай суполцы, проста знаёмым, якія падзяляюць Вашы погляды, але магчыма ня ведаюць пра такую крыніцу інфармацыі, як «НН».

Што ім трэба сказаць? Што «Наша Ніва» дае праўдзівую інфармацыю, новыя ідэі, пажыву для розуму ў камэнтарах, унікальныя фатаграфіі, а самае важнае — пачуцьце беларускай супольнасьці. Яна хутка даходзіць, друкуецца ў Беларусі.

У гэтыя найцяжэйшыя для свабоднай прэсы гады «Наша Ніва» ўмацавалася ў сваім пакліканьні як трыбуны незалежнага грамадзтва. Дзякуючы Вам.

Няхай 2008 год будзе добрым годам.

№ 47 (549) 20 сьнежня 2007 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

# «Нафтан» прадаюць «Лукойлу»?

Чаму не паведамляецца цана газу на другі квартал? Яна можа залежаць ад чагосьці, што Беларусь павінна выканаць у першым квартале году, мяркуюць незалежныя экспэрты. Таму вынікі перамоваў Лукашэнкі з Пуціным ня можна назваць прыемнымі. Старонкі 3—5.



# Не па-людзку




Беларусь стала адной з рэдкіх краінаў, дзе пэнсіянэры і студэнты ня маюць ільготаў. Старонка 2.

## У НУМАРЫ

### Пас Вітаўта на Маркса

У Гістарычным музэі будзе выстаўлены Срэбны пояс Вітаўта. Завяршэньне атрымала адна з самых гучных справаў апошняга часу, зьвязаная з нацыянальным скарбам. **Старонка 16.**

### Зьміцер Хведарук: «Пасьля выздараўленьня пайду ў трэнажорку»

Зьміцер Хведарук працягвае знаходзіцца ў дзявятым клінічным шпіталі, што на вуліцы Сямашкі. Сюды яго прывезьлі 12 сьнежня вечарам: хлопца зьбілі амонаўцы падчас акцыі ў абарону незалежнасьці Беларусі. **Старонка 10.**

### NATO і Беларусь: стратэгічнае партнэрства

Нягледзячы на ідэалягічныя разыходжаньні сярод высокіх чыноў, простыя сувязі між вайскоўцамі Беларусі і NATO няспынна растуць. Ужо цяпер мы бярэм удзел амаль у сотні супольных мерапрыемстваў. А ў беларускім войску зьявіцца спэцыяльная рота, якая можа браць удзел у міратворчых місіях. Рэпартаж з штаб-кватэры NATO. **Старонка 14.**

# Пацукі генэрала Жадобіна

Жадобін: у Беларусі 1767 «дэструктыўных элемэнтаў»

«Мы іх усіх ведаем пайменна, і іх ня робіцца ні больш, ні менш». Пра гэта заявіў сёньня старшыня КДБ Юры Жадобін.

Адказваючы сёньня на пытаньні журналістаў, Юры Жадобін сярод іншага заявіў, што прагназуе актывізацыю замежных спэцслужбаў у пэрыяд выбарчай кампаніі 2008 году. «Я ў гэтым упэўнены, бо ў мяне ёсьць факталягічны матэрыял: хто колькі грошай і праз каго будзе ўкідваць і што яны будуць спрабаваць рабіць».

Гаворачы пра апазыцыю, старшыня КДБ адзначыў: «Я б не сказаў, што яны ўяўляюць нейкую пагрозу нацыянальнай бясьпецы, у так званую супольнасьць дэструктыўных элемэнтаў уваходзіць усяго 1 767 асобаў. Мы іх усіх ведаем пайменна, і іх ня робіцца ні больш, ні менш».

Называньне апазыцыі «супольнасьцю дэструктыўных элемэнтаў» мае ўсе шанцы стаць такой жа прытчай ва языцах, як «дохлыя пацукі» ягонага папярэдніка, генэрала Сухарэнкі, які бясслаўна скончыў сваю кар'еру ў органах бясьпекі. А вось прызнаньне, што «іх ня робіцца менш» можа не спадабацца працадаўцу генэрала Жадобіна. Якая ж ступень дэструктыўнасьці гэтай супольнасьці, што яе нават сьмерць не бярэ?

**Мікола Бугай; радыё «Свабода»**

## АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

**Ці вы плянуеце глядзець «БелСат»?**

| | |
|---|---|
| так | 257 (49.3%) |
| не | 22 (4.2%) |
| ня маю антэны | 242 (46.4%) |

Усяго прагаласавала 521

## У Салігорску, Слуцку, Горадні, Берасьці, Бярозе, Карэлічах, Віцебску і Пецярбургу

Сустрэчы з рэдактарамі і аўтарамі «НН» і ARCHE.

**У чацьвер, 20 сьнежня, у Горадні (сядзіба Таварыства беларускай школы, вул. Будзёнага 48 а)** адбудзецца адзіная рэгіянальная прэзэнтацыя спэцыяльнага праекту ARCHE «Беларусь: ні Расея, ні Эўропа. Меркаваньні беларускіх эліт». Прысутных чакае сустрэча з аўтарамі кнігі — дырэктарам Беларускага інстытуту стратэгічных дасьледаваньняў Віталем Сіліцкім, галоўным рэдактарам часопісу ARCHE Валерам Булгакавым, а таксама палітолягам Юр'ем Чавусавым і супрацоўнікам Інстытуту сацыялёгіі АН Міколам Кацуком. Плянуецца раздача выданьня. **Пачатак а 18.30.**

**Увага! Сустрэча ў Берасьці пераносіцца.** Булгакаў, пісьменьніца Наталка Бабіна і рэдактар «НН» Андрэй Скурко наведаюць Берасьце **21 сьнежня. Сустрэча адбудзецца а 19.00 у рэдакцыі газэты «Брестский курьер».** Даведкі: (029) 660–57–41, (029) 724–21–16 (Зьміцер). **У той самы вечары, а 21-й, яны сустрэнуцца з чытачамі ў Бярозе.** Даведкі: (029) 223–40–84 (Сяржук).

**На канец сьнежня — студзень маем у задумах сустрэчы з чытачамі ў Пецярбургу** (там адбудзецца цырымонія прысуджэньня прэміі ARCHE за 2007 год)**, у Карэлічах і Віцебску.** Дакладны час гэтых спатканьняў яшчэ ня вызначаны.

Запрашайце нас, і мы прыедзем, нават у самую малую вёсачку, дзеля сур'ёзнага абмену думкамі і прэзэнтацыі апошніх выданьняў.

## КАМЭНТАР

# Не па-людзку

Час скасаваньня ільготаў нарэшце надышоў. Старых і маладых прыраўнялі да вялікай грамады паўналетніх працоўных і служачых. Зрабілі гэта, праўда, не па-людзку. Урадоўцы ня здолелі дачакаць да Новага году, распачаць рэформу зь першага дня новага месяца. «Чорным днём» ільготніка прызначылі 17 сьнежня. Аўтобусныя паркі нават ільготныя праязныя адмысловыя выдрукавалі — на палову месяца. Калі так прысьпешваюць, мо сапраўды ня ўсё добра ў каралеўстве?

Па радыё ж распавядаюць, колькі дзяржава злупіць ды зьберажэ дадатковых грошай. На патрэбы дзяржавы ж. Праўда, на якія патрэбы ў той дзяржаве… А ў краіне ніхто добра і ня ведае, колькі ж будуць даплочваць і ці будуць наагул.

На прыпынку пачуў, як старая жалілася знаёмай кабеце пра цяжкі лёс пэнсіянэраў. Што грошай бракуе, а тут яшчэ гэтыя льготы. Знаёмая рэзка яе абарвала. Маўляў, вам колькі разоў на год пэнсію ўздымалі? А мой мужык на заводзе як на пачатку году атрымліваў 310 тысячаў, так і цяпер такі самы заробак прыносіць. Дык каму ж тут жыць цяжэй. А яшчэ ж сям'я, дзеці вучацца… Бабця пагаджаецца: дык яшчэ ж і моладзь пакрыўдзілі...

Скасаваньне ільготаў закранула, відаць, кожную сям'ю. Тыя, хто «пацярпеў» у 1995 годзе ад скарачэньня ільготаў, пасьміхаюцца: а, дайшла чарга і да вас.

У Баранавічах прыкладна за тыдзень да 17 сьнежня пачалася своеасаблівая прапагандысцкая кампанія. Паміж беларускамоўнымі абвяшчэньнямі прыпынкаў уключаюць расейскамоўную абвестку. Суворы голас папярэджвае пра скасаваньне льготаў на праезд. Пералічваюцца катэгорыі грамадзянаў, якім болей нельга катацца ў грамадзкім транспарце за паўцаны. Парушэнцаў будуць сувора караць штрафамі, прозьвішчы — заносіць у адміністрацыйную базу пакараньняў і паведамляць на месца працы ці вучобы. (Цікава, а куды паведамляць пра пакараных пэнсіянэраў? Дзецям?) З 17 сьнежня аўтобусны парк прыцягне дадатковыя сілы для лепшага кантролю пасажыраў, таму сьцеражыцеся.

У аўтобусе пасьля такіх абвестак пануе ціша. Гамонкі сканчаюцца, кожны думае пра нешта сваё. Маўчыць моладзь, маўчаць старыя, пазіраюць у вакно працоўныя і служачыя. Відаць, гэтак жа людзі рэагавалі на абвесткі пра вайну з радыёкропак у 1939 годзе.

Тую напружаную цішу перарывае ледзь чутны, узрушаны шэпт нейкага старога:

— Трэба пісацца ў «Народны Фронт»! Чаму маўчыць «Народны Фронт»?

Нехта з маладзейшых яго перабівае:

— А ці слухаеце Вы яго? Усё адно праз два гады забудзецеся і прагаласуеце за Лукашэнку. У Вас жа склероз.

Ціша пануе да наступнага прыпынку. Ніхто ня згадвае, што ёсьць прафсаюзы ці БРСМ — «абаронца» моладзі. У аўтобус на наступным прыпынку заходзяць новыя людзі, некаторыя весела гутараць. Яны яшчэ пачуюць…

**Руслан Равяка, Баранавічы**

# Чаму не паведамляецца цана газу на другі квартал?

Далейшая цана можа залежаць ад чагосьці, што Беларусь павінна выканаць у першым квартале году. Вынікі перамоваў Пуціна ды Лукашэнкі нельга назваць прыемнымі для Беларусі, мяркуюць незалежныя экспэрты.

Вынікі візыту Пуціна ў Беларусь выявіліся нашмат менш сэнсацыйнымі, чым чакалася. Нават рашэньне пра выдзяленьне Беларусі крэдыту ў паўтары мільярда даляраў выглядае бляўкла на тле папярэдніх закідаў інфармацыі пра нібыта заплянаванае зьліцьцё дзьвюх краінаў у братэрскіх абдымках з наступным разьмеркаваньнем пасадаў.

«Чаго ён едзе?» — пыталіся камэнтатары напярэдадні візыту Пуціна ў Менск. Перафразаванае пытаньне «чаго ён прыяжджаў?» дагэтуль гучыць актуальна, бо кардынальных палітычных зьменаў у стасунках паміж дзьвюма краінамі па выніках перамоваў не адбылося. Нельга ж назваць «прарывам у саюзным будаўніцтве» павелічэньне на 10% саюзнага бюджэту на 2008 год (такім чынам ён складзе 4 зь лішкам мільярдаў расейскіх рублёў, то бок каля 167 мільёнаў даляраў). З такім бюджэтам у беларуска-расейскі хаўрус Эўрасаюз яшчэ доўга не завабіш, як бы таго ні хацеў Павал Барадзін.

Калі адкінуць у бок гіпотэзы пра падкілімныя патаемныя пагадненьні, якія, мабыць, маглі заключыць між сабой Пуцін ды Лукашэнка, то канкрэтныя вынікі перамоваў мусяць зацікавіць найперш эканамістаў. Зімовай газавай вайны чакаць ня варта блакітнае паліва падаражэе толькі на 19 даляраў. Ад 2008 г. расейскі газ будзе пастаўляцца ў Беларусь па 119 даляраў за тысячу кубоў — але гэта толькі ў першым квартале. Потым мы будзем плаціць за газ болей. Але сума не паведамляецца, што вымушае меркаваць, што далейшая цана *можа* залежаць ад чагосьці, што Беларусь павінна выканаць у першым квартале году.

Адначасова Расея абавязалася выдзяліць Беларусі крэдыт памерам 1,5 мільярда даляраў на пятнаццаць гадоў з адтэрміноўкай выплаты на пяць гадоў.

## Афіцыйныя погляды

Расейскі бок тлумачыць візыт Пуціна ў Менск найперш тым, што наназьбіралася шмат даволі банальных міждзяржаўных пытаньняў, якія трэба было вырашыць адным рубам. Размовы на падвышаных танах ня было. «Не крыўдуйце, сябры, але мы таксама маем свае эканамічныя інтарэсы і мусім зарабляць грошы» — такі быў ляйтматыў заяваў расейскага боку. На прэсавай канфэрэнцыі па выніках паседжаньня Вышэйшага дзяржсавету «саюзнай дзяржавы» Уладзімер Пуцін заявіў, што газ для Беларусі насамрэч не падаражэе. Расея сама мусіць закупляць вялікія аб'ёмы газу ў сярэднеазіяцкіх дзяржаваў, у тым ліку і для рээкспарту ў іншыя краіны СНД. Гэтак, туркменскі газ Расея будзе набываць па 130 даляраў за тысячу кубоў. Такім чынам, Беларусь усё роўна будзе атрымліваць газ у ільготным рэжыме. Маўляў, цэны мы вам падвысілі, але скажыце дзякуй, што ня так рэзка.

Тон афіцыйных беларускіх камэнтатараў таксама даволі спакойны. Рост цэнаў на расейскія энэрганосьбіты разглядаецца як непазьбежнасьць, таму акцэнт робіцца не на «сквапным «Газпроме», а на «сяброўскім Крамлі», які выдзяліў шчодры крэдыт на тое, каб беларуская эканоміка магла як мага больш бязбольна ўспрыняць рост цэнаў. «Што з гэтага вынікае? Варта жыць», — раіць чытачам «СБ Беларусь Сегодня», заклікаючы не зацыклівацца на праблемах, а адаптавацца да жыцьця ў рынкавых умовах.

## Беларусы незадаволеныя

Падвышэньне цаны на газ на 19 даляраў нельга назваць шокам. Дый гіганцкі крэдыт на 1,5 мільярда даляраў — немалая падтрымка для эканомікі. Ці можна сказаць, што такія ўмовы дазволяць Беларусі працягнуць свой рост, а насельніцтву — падвышаць свой дабрабыт? Адказваючы на гэтае пытаньне, незалежныя экспэрты не выказваюць вялікага аптымізму. Прапанаваныя Расеяй умовы не такія ўжо спрыяльныя. Прынамсі, назваць іх калядным падарункам дакладна нельга.

Аглядальніца газэты «Белорусы и рынок» Таццяна Манёнак паведаміла некаторыя сэнсацыйныя акалічнасьці перамоваў наконт цаны на газ. Паводле яе, толькі цяпер робіцца зразумелымі некаторыя дэталі пагадненьня, падпісанага напрыканцы 2006 году паміж Беларусьсю і «Газпромам». «Паводле дамовы, у першым квартале 2008 цана газу для Беларусі ня мусіць падвышацца больш чым на 19 працэнтаў — раней я сама ня ведала пра гэты пункт. Гэта і здарылася (замест 100 будзем плаціць 119 даляраў). Але ўжо праз тры месяцы цана газу для Беларусі будзе складаць 67% ад сярэднеэўрапейскай. Беларускі бок моцна не задаволены вынікамі перамоваў, бо яны вялі размову, каб дабіцца перагляду самой формулы», — сьцвярджае Таццяна Манёнак, спасылаючыся на свае крыніцы ва ўрадзе.

## Новы раўнд — праз тры месяцы

Экспэрт Дасьледчага цэнтру Інстытуту прыватызацыі і мэнэджмэнту Аляксандар Чубрык лічыць, што гэткая дамоўленасьць проста адсоўвае перамовы наконт цаны на газ на тры месяцы, ня больш за тое. «Мяккае падвышэньне цаны ды расейскі крэдыт беларускаму эканамічнаму росту самі сабою паспрыяць ня могуць», — кажа А.Чубрык. «Калі мы атрымаем гэтыя паўтара мільярда крэдыту, дык пойдуць не на фінансаваньне спажываньня ды інвэстыцыяў, а ў рэзэрвы Нацбанку», — мяркуе экспэрт. Сапраўды, Нацбанк паставіў сабе задачу за 2008 год павялічыць валютныя рэзэрвы з 3,5 да 5,5 млрд даляраў, каб забясьпечваць стабільнасьць валютнага курсу. «Такім чынам, гэтыя 1,5 мільярду трэба разглядаць як звычайны стабілізацыйны крэдыт. Яго памер роўны палове ўсіх нашых сёньняшніх валютных рэзэрваў, якія пакрываюць менш чым два месяцы імпарту, прытым што паводле крытэраў МВФ бясьпечны ўзровень складае раўнавартасьць трох месяцаў імпарту.

Нявырашаныя праблемы на ўнутраным рынку будуць спалучацца са складанасьцямі на замежных рынках, засьцерагаюць незалежныя эканамісты. Экспарт у гэтым годзе ў нас рос дзякуючы росту экспарту калійных угнаеньняў. Таксама 2007 год выявіўся вельмі спрыяльным для машынабудаваньня, дзякуючы росту попыту ў Расеі.

Дасьледчы цэнтар ІПМ распрацаваў тры сцэнары эканамічнага разьвіцьця Беларусі ў 2008 г. Паводле станоўчага сцэнару мы будзем мець налета тэмпы росту ВУП роўныя 8,6%. Паводле базавага сцэнару — дзесьці каля 8%, а згодна з адмоўным — менш за 7%.

І 100 даляраў сёлета, і 119 у наступным годзе — гэта самая нізкая цана ў СНД, ня кажучы пра Эўрасаюз.

**Алесь Кудрыцкі**

# «Нафтан» прадаюць «Лукойлу»?

Учора на наваполацкім нафтаперапрацоўчым заводзе «Нафтан» адбылася апэратыўная нарада. На ёй генэральны дырэктар прадпрыемства Вячаслаў Якушаў паведаміў, што бліжэйшым часам «Нафтан» будзе прададзены расейскай нафтавай кампаніі «Лукойл». Разам з «Нафтанам» расейцам будзе таксама прададзенае і даччынае прадпрыемства «Нафтану» «Палімір». Пра гэта «Нашай Ніве» паведаміў адзін з супрацоўнікаў заводу, які не захацеў называць сваё імя.

Паводле ягонай інфармацыі, «Лукойл» хоча набыць больш за 50% акцыяў «Нафтану».

Намесьнік генэральнага дырэктара па эканоміцы і фінансах Анатоль Юдаеў сказаў, што ніяк гэтыя размовы камэнтаваць ня будзе. На пытаньне, ці можа гэта нехта пракамэнтаваць увогуле на «Нафтане», быў адказ: «На гэты конт ніхто камэнтароў на заводзе пакуль даваць ня будзе».

У прэс-службе расейскай кампаніі «Лукойл» паведамілі, што камэнтуюць толькі ўгоды, якія ўжо адбыліся, пасьля таго, як кантракты ўжо падпісаныя. Пытаюся, ці пацьвярджаюць яны, што перамовы пра куплю «Нафтана» вядуцца. Той самы адказ: «Пакуль ня можам гэтага камэнтаваць».

Нафтаперапрацоўчы завод «Нафтан» створаны ў 1958 годзе. Дзяржаве належаць 99,8% акцыяў, калектыву прадпрыемства — 0,2%. Гэта адно з самых дарагіх прадпрыемстваў Беларусі.

**Зьміцер Панкавец**

## Маркаў: Лукашэнка гатовы аб'яднаць дзяржавы, калі яму знойдуць адпаведнае месца

Наколькі далёка зайшлі палітычныя перамовы паміж расійскім і беларускім прэзыдэнтамі? У інтэрвію агенцтву БелаПАН расійскі палітолаг, дэпутат Думы ад партыі «Адзіная Расія» Сяргей Маркаў заявіў: Расія выступае за максымальна хуткае «ўзьяднаньне» дзьвюх краінаў. Але беларускі бок аказаўся незадаволены, па-першае, расійскай грамадзкай мадэльлю, па-другое, прапанаваным месцам для Аляксандра Лукашэнкі ў аб'яднанай дзяржаве.

«Ён, вядома, хацеў бы быць прэзыдэнтам аб'яднанай дзяржавы, і пры Ельцыне ў яго былі для гэтага ўсе рэальныя шанцы. Але пры Пуціне, пры Мядзьведзеве такіх шанцаў у яго няма. Вядома, што яму прапаноўвалася і пасада прэм'ер-міністра, і віцэ-прэзыдэнта, але гэта яго не задаволіла. Ён хацеў адначасова быць і прэм'ер-міністрам, і віцэ-прэзыдэнтам, гэта значыць «паралельным прэзыдэнтам». Але Масква не гатова пайсці на гэта. Так што гэтае пытанне засталося ў падвешаным стане», — мяркуе палітоляг.

**буг; БелаПАН**



Пуцін і Лукашэнка: фота агенцтва «РИА «Новости»

## СЬЦІСЛА

### Беларускі калій у цане

«Беларуская калійная кампанія» (БКК) павысіла цану на ўгнаеньні для краінаў Паўднёва-Ўсходняй Азіі да $500 за тону. Новая цана для рынкаў Паўднёва-Ўсходняй Азіі ўступіла ў сілу з 13 сьнежня.

### Узмацненьне кантролю за льготным жыльлём

Спэцыялісты Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва распрацоўваюць прапановы па ўпарадкаваньні ўліку жыльля, што знаходзіцца ва ўласнасьці грамадзянаў, якія маюць патрэбу ў паляпшэньні жыльлёвых умоваў. Гэта зьвязана з тым, што некаторыя мянчане, у тым ліку шматдзетныя сем'і, будуюць у прыгарадах індывідуальныя дамы, аднак працягваюць стаяць на ўліку маючых патрэбу ў жыльлі ў Менску.

Таксама некаторым катэгорыям людзей дзяржава дае падтрымку на пабудову кватэраў, тады як пабудаваныя імі ў прыгарадзе дамы часта маюць вялікую плошчу і зьяўляюцца крыніцай дадатковага даходу. Таму мяркуецца стварыць механізм для яго заліку па ацэнцы БРТІ пры разьліку аб'ёму дзяржпадтрымкі.

Таксама ў апошнія гады ў сталіцу і абласныя гарады зь меншых паселішчаў актыўна пераяжджалі шматдзетныя сем'і. Яны прадавалі сваё жыльлё, куплялі за гэтыя грошы невялікія аднапакаёўкі, станавіліся на чаргу і ў адпаведнасьці з законам на працягу году будавалі жыльлё на льготных умовах.

### ЭБРР набывае пакет «РРБ-Банку»

Эўрапейскі банк рэканструкцыі і разьвіцьця набывае блякуючы пакет акцыяў беларускага ЗАТ «РРБ-Банк». Сума кантракту пакуль не разглалошваецца.

### Расея дае дабро польскаму мясу

12 сьнежня Расея і Польшча дамовіліся пра аднаўленьне паставак у РФ польскай жывёлагадоўчай прадукцыі. Гэта азначае, што беларускія мясакамбінаты, напрыклад, такі буйны як «Інкафуд», ізноў будуць загружаныя. Канфлікт паміж дзяржавамі ўсчаўся ў лістападзе 2005 г. і меў палітычную падбіўку.

**Сямён Печанко; БЕЛТА**



Пуцін і Лукашэнка: фота агенцтва БЕЛТА

# Паўтара мільярду за ноч

Галоўны вынік двухдзённага візыту Пуціна: Расея дае Беларусі гіганцкі крэдыт у аб'ёме 1,5 млрд даляраў з адтэрміноўкай выплаты на пяць гадоў. Уладзімер Пуцін і Аляксандар Лукашэнка не дэманстравалі натхненьня і далі абцякальныя тлумачэньні зьместу двухдзённых перамоваў.

Пуцін: Цэны на газ для Беларусі «ў межах, вызначаных ранейшым кантрактам». З свайго боку, Лукашэнка асьцярожна: Беларусь «гатовая згуляць сваю ролю ў пытаньні меркаванага разьмяшчэньня ў Эўропе элемэнтаў сыстэмы проціракетнай абароны ЗША».

«Дзеля забесьпячэньня плаўнага пераходу двухбаковага супрацоўніцтва на ўнівэрсальныя рынкавыя прынцыпы з улікам абавязковага для абодвух бакоў выкананьня падпісаных раней пагадненьняў і кантрактаў, Расея прыняла рашэньне аб прадастаўленьні Беларусі дзяржкрэдыту ў памеры 1,5 млрд даляраў», — заявіў прэзыдэнт Расеі Уладзімер Пуцін пасьля паседжаньня дзяржаўнай рады г. зв. саюзнай дзяржавы.

Як перадае агенцтва РИА «Новости», ён таксама падкрэсьліў, што Расея будзе выконваць ранейшыя кантракты, заключаныя зь Беларусьсю ў газавай сфэры.

«Нягледзячы на тое, што сама Расея будзе плаціць за газ падвышаныя цэны, мы для Беларусі будзем выконваць ранейшыя кантракты», — заявіў У. Пуцін на прэс-канфэрэнцыі па выніках візыту.

«Падвышэньне цэнаў на газ будзе, але так, як прадугледжана ранейшымі кантрактамі», — падкрэсьліў Пуцін. Ён прызнаў, што Расея разумее цяжкасьці, якія выяўляюцца ў беларускай эканоміцы ў выніку росту цэнаў, «і будзе рабіць усё для мінімізацыі гэтых наступстваў».

А. Лукашэнка ў сваю чаргу абяцаў, што Беларусь забясьпечыць стабільны транзыт вуглевадародаў з Расеі ў Эўропу. За гэта ён чакае ад «багатай Эўропы» ўдзячнасьці: «Беларусь і Расея робяць вялізны ўнёсак у эканамічную і сацыяльна-палітычную стабільнасьць эўрапейскага кантынэнту. Мы чакаем у сувязі з гэтым адэкватных крокаў ад Эўропы».

«Эўрапейскі саюз, багатая Эўропа будзе пачувацца спакойна», — ва ўласьцівай яму манеры адзначыў А.Лукашэнка.

Маскве ж А. Лукашэнка публічна, але вельмі абцякальна паабяцаў, што Беларусь «гатовая згуляць сваю ролю ў пытаньні меркаванага разьмяшчэньня ў Эўропе элемэнтаў сыстэмы проціракетнай абароны ЗША». Беларусь таксама «гатовая цесна каардынаваць свае дзеяньні з расейскім бокам па адаптацыі Дамовы пра звычайныя ўзброеныя сілы ў Эўропе (ДЗУСЭ)». Гэта не перашкодзіла набліжанаму да А. Лукашэнкі Мікалаю Чаргінцу сёньня ж задэклараваць, што не ў інтарэсах Беларусі далучацца да расейскага мараторыю па ДЗУСЭ, уведзенага за дзень да прылёту Пуціна ў Менск.

Ці то лідэры дзяржаваў старанна маскіравалі рэальны зьмест перамоваў, ці то сапраўды гэта была руцінная сустрэча сюзэрэна з васалам.

У. Пуцін так і сказаў: «Аб'ём узаемных стасункаў адпраўляе на другі плян усялякі афіцыёз, але калісьці трэба заняцца і абмеркаваньнем афіцыйных пытаньняў».

Беларускія СМІ смакавалі той факт, што гэты візыт Пуціна — першы афіцыйны за 8 гадоў. Гэтым разам расейская дэлегацыя была больш чым салідная: прэм'ер-міністар Віктар Зубкоў, старшыня Рады Фэдэрацыі Сяргей Міронаў, сьпікер Думы Барыс Грызлоў, віцэ-прэм'ер і міністар фінансаў Аляксей Кудрын і міністар эканамічнага разьвіцьця Эльвіра Набіуліна.

А. Лукашэнка імкнуўся паказаць афіцыйны характар сустрэчы: «Нічога надзвычайнага ў візыце расейскага прэзыдэнта ў Менск няма, — сказаў ён. — Той ажыятаж, які выклікаў візыт на Захадзе — дзіўны. (...) Няма ніякае падаплёкі ў гэтым візыце. (...) Для мяне вельмі дзіўна, што і ў Расеі, і ў Беларусі выказваліся вялікія прагнозы з нагоды афіцыйнага Вашага візыту ў Беларусь», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы, зьвяртаючыся да У. Пуціна.

«Мы, сапраўды, як сяброўскія саюзныя дзяржавы сустракаемся ў Менску, і было б дзіўна, што Вы ў якасьці прэзыдэнта Расеі не пабывалі ў Менску з афіцыйным візытам. Мы з Вамі выявілі ў Душанбэ, што мы ўвесь час сустракаліся ў працоўным фармаце і ніколі не было Вашага афіцыйнага візыту ў сталіцу Беларусі».

Самалёт прэзыдэнта Расеі мусіў прызямліцца ў чацьвер у менскім аэрапорце а 18.00, але затрымаўся на гадзіну з гакам. Перамовы распачаліся з сустрэчы двух прэзыдэнтаў у Сілічах — збудаваным А. Лукашэнкам комплексе, што ў Лагойскім раёне.

У пятніцу перамовы прадоўжыліся паседжаньнем дзяржаўнай рады саюзу Беларусі і Расеі ў Нацыянальнай бібліятэцы.

У сувязі зь візытам Пуціна ў Менску й Берасьці адбыліся акцыі пратэсту, якія жорстка разганяла міліцыя. Затрыманыя 17 чалавек. Быў моцна зьбіты адзін зь лідэраў «Маладога фронту» Зьміцер Хведарук. У непрытомным стане ён трапіў у 9-ы клінічны шпіталь.

Ніякіх прарыўных палітычных дамоўленасьцяў не дасягнута. Затое па выніках візыту замежная запазычанасьць Беларусі вырасьце да 12 мільярдаў даляраў, або ўдвая проці стану на пачатак 2006 году. У нядаўняй гісторыі ўжо быў адзін кіраўнік, які хацеў пабудаваць сацыялізм за кошт капіталістаў. Гэта быў лідэр сацыялістычнай Польшчы Герак у 1970-я гады.

**Мікола Бугай**

# Нічога ня здарылася, або Гуманны Коба

Вынікі візыту Пуціна і прычыны таго, чаму Лукашэнка публічна спрабаваў прынізіць значэньне гэтага візыту, аналізуе **Віталь Тарас**.

Наколькі шмат было спэкуляцыяў і камэнтароў напярэдадні прыезду Пуціна ў Менск наконт мэтаў візыту, настолькі сьціплай і малазьмястоўнай была рэакцыя прэсы па яго завяршэньні. Сэнсацыі, як і прадказвала большасць палітолягаў, не адбылося — ніякіх дакумэнтаў, у тым ліку датычна лёсу так званай саюзнай дзяржавы, Лукашэнка з Пуціным не падпісвалі (за выключэньнем саюзнага бюджэту). Вынікі, канечне, ёсьць — найперш, гэта абяцаньне расейскага боку прадаставіць Беларусі стабілізацыйны крэдыт 1,5 мільярда даляраў і абяцаньне ня надта павышаць у бліжэйшым часе цэны на энэрганосьбіты.

Але пры ўважлівым разглядзе ўзьнікаюць сумневы і ў відавочнасьці гэтых вынікаў. Дакладней кажучы — у абгрунтаваньні зь іх дапамогай неабходнасьці прыезду прэзыдэнта Расеі ў Беларусь. Выдача крэдытаў іншым дзяржавам, тым больш саюзным — справа даволі руцінная, ва ўсялякім выпадку, асабістых сустрэчаў кіраўнікоў дзяржаваў наўрад ці патрабуе. Калі, зразумела, стасункі паміж гэтымі дзяржавамі больш-менш нармальныя. Ну, а публічнае пацьвярджэньне цэнаў на газ, прадугледжаных ранейшымі кантрактамі — рэч увогуле дзіўная.

Як тут ня ўспомніць анэкдот пра гуманізм Сталіна, які вылаяў свайго сукамэрніка ў адказ на ягоную просьбу пазычыць лязо, каб пагаліцца. «А мог бы й зарэзаць!» — захапляецца паводзінамі Кобы сукамэрнік. Маглі б павысіць цану за тысячу кубоў да 180-ці, а не да 119-ці даляраў, — захапляюцца Пуціным і «Газпромам» сучасьнікі.

У цэлым настрой супольнасьці палітолягаў і журналістаў па заканчэньні візыту Пуціна можна зьвесьці да вядомай фразы: «І чаго прыяжджаў — можа, сказаць чаго хацеў?»

Здагадвацца, што насамрэч хацеў сказаць Пуцін і што ў яго ў галаве — справа няўдзячная. Няхай ёй займаюцца маскоўскія крэмлязнаўцы, якія на гэтым зубы зьелі (па-расейску гаворыцца: сабаку зьелі). Адзін зь іх вылучыў такое тлумачэньне візыту расейскага прэзыдэнта: Пуцін, маўляў, спрабаваў сябе ў будучай ролі прэм'ер-міністра. Між тым, у

> Перад дыктатам Пуціна беларускаму кіраўніку нічога не застаецца як ісьці за парадай героя сатырычнага расейскага раману: рабіць разумны выгляд і надзімаць шчокі.

ролі прэм'ера ён ужо быў да таго, як Ельцын абраў Пуціна сваім пераемнікам. Малаверагодна, каб адбылася адваротная палітычная мэтамарфоза: ператварэньне матылька назад у вусеня. І ў любым выпадку гэтая вэрсія не дае адказу на пытаньне — а чаму Пуцін вырашыў прадэманстраваць сваё памкненьне стаць прэм'ерам такім мудрагелістым спосабам, праз сваю паездку ў Менск?

Паколькі падрыхтоўка да візыту і перамовы былі ахутаныя покрывам сакрэтнасьці, нам застаецца меркаваць пра мэты і падаплёку сустрэчы Пуціна з Лукашэнкам толькі на падставе сапраўды відавочных фактаў і дэталяў, што ляжаць на паверхні. Фактамі, зразумела, лёгка маніпуляваць — у прыватнасьці, з мэтай прыцямніць сэнс падзеяў. Але дастаткова крыху адступіць у мінулае, і многае паўстае зусім у іншым сьвятле.

### Сюрпрызаў ня будзе

Адзін зь вядомых нам гістарычных фактаў — апошнім разам старшыні абедзьвюх палатаў расейскага парлямэнту разам прыяжджалі ў Менск увосень 1996 году. Тады сьпікер Думы Селязьнёў і старшыня Рады Фэдэрацыі Строеў дурылі галаву старшыні Вярхоўнага Савету Шарэцкаму з тым, каб парлямэнт не ішоў супраць Лукашэнкі і саступіў ягонаму жаданьню правесьці рэфэрэндум аб пашырэньні ўладных паўнамоцтваў прэзыдэнта. Чым скончыўся візыт Селязьнёва і Строева (дарэчы, ці не апошняга расейскага губэрнатара «ельцынскага» прызыву) — усім вядома.

Цяперашнія сьпікеры — Грызлоў і Міронаў — прыехалі ў складзе дэлегацыі расейскага прэзыдэнта. Можна сказаць, што гэта ўсяго толькі пратакол, якога патрабаваў статут Вышэйшае дзяржрады. Але на кіраўніка беларускай дзяржавы, бадай, прыезд «трыюмвірату» з Масквы павінен быў зрабіць уражаньне. І пра падзеі 1996-га, пра палітычную падтрымку Масквы ён, мабыць, яшчэ не забыўся. А тым больш — пра палітычную падтрымку падчас выбараў 2006-га году.

Калі называць рэчы звычайнай, недыпляматычнай мовай, вышэйшая эліта расейскай дзяржавы прыехала ў Менск, каб чарговы раз нагадаць Аляксандру Лукашэнку, што за пазыкі трэба плаціць. І размова тычыцца ня столькі ранейшых пазыкаў у выглядзе танных газу й нафты — тут Крэмль згодны пачакаць, а палітычных рахункаў. У пэрыяд трансфармацыі ўлады ў Расеі, што мае неўзабаве адбыцца, Пуцін і ўсе, хто за ім ці побач зь ім стаяць, павінныя быць цьвёрда ўпэўненыя, што з боку зацятага хаўрусьніка Лукашэнкі якіх сюрпрызаў ня будзе.

Тое, што ва ўладнай расейскай эліты даўно высьпелі пляны танна прыдбаць рэсурсы Беларусі, сумненьняў ні ў кога не выклікае. Як сказаў адзін расейскі журналіст — купляюць жа на Захадзе «нічыйныя» выспы ў акіяне за пару мільёнаў даляраў, чаму б расейскім алігархам і чыноўнікам не купіць за пару дзясяткаў мільярдаў цэлую краіну?

А пакуль Пуціну і кампаніі важна, каб на заходнім напрамку было ня проста ціха — каб нават ценю пагрозы «аранжавай рэвалюцыі» (якой у Крамлі ўсё яшчэ панічна баяцца, як тыя сланы мышэй) на захадзе ад Масквы не ўзьнікала. Хопіць Расеі праблемаў з Украінай.

Таму Лукашэнку, як і раней, даецца карт-блянш у ягонай унутранай палітыцы. Ня тое што асуджэньня за парушэньні правоў чалавека і абсалютызм Крэмль ня выкажа. Ён абяцае яму поўную палітычную і эканамічную падтрымку. Не абяцае — перадае ў палітычную спадчыну. Разам зь пераемнікам. Будучым сябрам Вышэйшае дзяржрады саюзнай дзяржавы.

Тут цікава ўзгадаць артыкул у «Советской Белоруссии», які зьявіўся напярэдадні візыту Пуціна. Публікацыя была прысьвечаная вылучэньню Дзьмітрыя Мядзьведзева ў прэзыдэнты. На думку газэты, нават калі б у якасьці пераемніка Пуцін ухваліў эстраднага гумарыста Петрасяна, кандыдатура яго ўсё адно атрымала б усеагульную падтрымку ў Расеі. Заўвага, мабыць, слушная. Але жаданьня сьмяяцца не выклікае. Напэўна, аўтару не хапіла фантазіі, каб уявіць, што недзе праз год— два адбудзецца візыт у Менск прэзыдэнта… Мядзьведзева. І тады публікацыяў, падобных згаданай вышэй, у газэце Адміністрацыі прэзыдэнта РБ, напэўна, ужо ня будзе.

## Палітычны запавет

А што ж кіраўнік РБ? Парадаксальным чынам ён упершыню для сябе апынуўся ў падобнай сытуацыі, як бы ў інфармацыйным цені. Калі раней у часе яго сустрэчаў з расейскім партнэрам на вышэйшым узроўні (дый у рамках самітаў СНД) менавіта ад Лукашэнкі найперш чакалі сэнсацыяў і скандалаў, дык гэтым разам галоўным і адзіным ньюзмэйкерам быў Пуцін. Большасьць камэнтатараў і экспэртаў калі й чакалі сюрпрызаў, дык толькі ад прэзыдэнта Расеі (уменьне выдаваць якія ён не аднойчы дэманстраваў раней). Чамусьці многія апрыёры лічылі і лічаць, што калі Пуцін захоча стаць кіраўніком саюзнай дзяржавы Беларусі, дык ён ім стане. І ад палітычнай волі Лукашэнкі тут мала што залежыць.

Калі нават такое меркаваньне і ня мае рэальных падставаў, гэтым разам кіраўнік Беларусі ператварыўся намаганьнямі расейскай прэсы ў асобу залежнага стану. Іншымі словамі, Пуцін прапіярыў сваю палітыку за кошт сустрэчы з Лукашэнкам.

І гэта выклікала непрыхаванае раздражненьне Рыгоравіча.

Асабліва паказальным падаецца ўяўнае зьдзіўленьне Лукашэнкі з таго, што на Захадзе, нібыта, быў узьняты «ажыятаж» вакол плянаванага візыту расейскага калегі ў Менск. Справа ня ў тым, што «ажыятаж» узьнік акурат не ў заходняй, а ў расейскай прэсе — пасьля таго, як «Эхо Москвы» распаўсюдзіла сэнсацыйную навіну пра падпісаньне Канстытуцыйнага акту саюзнай дзяржавы са спасылкай на неназваную крыніцу ў атачэньні Лукашэнкі. Справа ў тым, што кіраўнік дзяржавы, якая прымала высокага госьця, у ягонай прысутнасьці публічна спрабаваў прынізіць значэньне гэтага візыту. Фактычна, калі адкінуць інвэктыву ў бок Захаду, кіраўнік РБ назваў сустрэчу на вышэйшым узроўні з сваім расейскім калегам малазначнай, шараговай падзеяй.

На гэтым ніхто не акцэнтаваў увагу. Але цікава, што і расейскі бок, па сутнасьці, негалосна пагадзіўся з такой ацэнкай. У афіцыйных СМІ, асабліва расейскіх, саміт асьвятляўся вельмі фармальна і скупа. Надаць яму яшчэ меней увагі — азначала б проста выйсьці за межы прыстойнасьці.

Нават заява Лукашэнкі пра тое, што Беларусь гатовая адыграць актыўную ролю ў процістаяньні плянам разгортваньня ПРА ў Эўропе, ня выклікала вялікага энтузіязму Пуціна. Бо ў іх вачах менавіта Пуцін, і ніхто іншы на сёньня, ёсьць «нацыянальным лідэрам» і абаронцам Расеі. Двух «нацлідаў» у адной дзяржаве быць ня можа. Тым больш, калі надзеі на стварэньне саюзнай дзяржавы зусім слабыя, а кіраўнік Беларусі яўна не зьбіраецца перадаваць сваю ўладу нікому.

Візыт Пуціна ў Менск можна разглядаць ня як намер вярнуцца на палітычную арэну ў ролі кіраўніка аднаўленага Савецкага Саюзу (чалавек цьвярозага складу, ён мусіць разумець усю марнасьць падобных спадзеваў), а як свайго роду складнік палітычнага запавету. Па-першае, ён пасылае своеасаблівы сыгнал той частцы свайго электарату, якая ўсё яшчэ верыць у магчымасьць вяртаньня ў СССР і ў братнія пачуцьці беларускага народу: у Беларусі ўсё спакойна, мы тут застаемся надоўга і адчуваем сябе як дома. А па-другое, Пуцін дэманструе Захаду нязьменнасьць замежнапалітычнага курсу Расеі, абазначанага ім яшчэ ў славутай прамове ў Мюнхэне. І пры гэтым дае зразумець Эўропе на прыкладзе Беларусі, як Расея на самай справе разумее раўнапраўны дыялёг і гатовасьць весьці перамовы зь іншымі краінамі. То бок, з гледзішча Масквы, гэта могуць быць толькі перамовы з пазыцыі сілы. Адносна танныя энэрганосьбіты ў абмен на лаяльнасьць і максымальнае спрыяньне інтарэсам расейскіх дзяржкарпарацыяў.

Беларускі бок ня можа гэтага не разумець. Але афіцыйны Менск у цяперашняй сытуацыі, калі захоўваецца жорсткая залежнасьць эканомікі ад расейскіх энэрганосьбітаў і расейскай дзяржаўнай палітыкі, лічыць за лепшае выдаваць сапраўднае за жаданае. А ўсьлед за начальствам і прэсе нічога не застаецца як ісьці за парадай героя сатырычнага расейскага раману: рабіць разумны выгляд і надзімаць шчокі.

# Апошні месяц па старых цэнах!

Толькі да праваслаўных Калядаў (7 студзеня) кнігі сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва» будуць прадавацца па старых цэнаў. З 2008 году цэны павышаюцца на 50 %. Зрабі падарунак сабе, а нават сваім унукам.

Замаўляйце кнігі праз
029-505-39-11
029-126-36-87
knihi@me.by




**Вясна народу:** Эсэістыка 1991—2007




**Віталь Тарас. Звыклае зло.** Зборнік эсэ.




**Застаемся!** Сакавік 2006: Прыватнае і агульнае

Увага! Засталіся апошнія дзесяць асобнікаў!




**Сямён Печанко. У беларускім войску:** Падарунак прызыўніку.




**Бабілёнская бібліятэка:** Замежная літаратура ў перакладах «Нашай Нівы».

Эдгар Алан По, О. Генры, Яраслаў Гашак, Бруна Шульц, Альбэр Камю, Хорхэ Люіс Борхэс ды іншыя — на роднай мове




**Алесь Кудрыцкі. Суд на Каляды.** Зборнік публіцыстыкі.




**Андрэй Хадановіч. Сто лі100ў на tut.by.** Новая кніга паэта, якога няма патрэбы прэзэнтаваць.

Увага! У продажы застаецца апошняя сотня асобнікаў!




**Наталка Бабіна. Крыві не павідна быць відна**

Кнігу склалі апавяданьні і дэтэктыўная аповесьць.




**Наталка Бабіна. Рыбін горад.** Раман




**Паветраны шар**: беларускае мужчынскае апавяданьне

У кнігу ўвайшлі найлепшыя мужчынскія апавяданьні 1991—2007 гадоў у выбарцы «Нашай Нівы». Гэта апавяданьні Вячаслава Адамчыка, Уладзімера Арлова, Ігара Бабкова, Васіля Быкава, Лявона Вольскага, Адама Глёбуса, і іншых — усяго 30 аўтараў.




**Жанчыны выходзяць з-пад кантролю:** Беларускае жаночае апавяданьне

У зборнік увайшлі творы найлепшых сучасных аўтарак: Тацьцяны Барысік, Евы Вежнавец, Марыі Роўды ды іншых.




**Найясьнейшая Рэч Паспалітая:** Цывілізацыя—Культура—Рэлігія—Палітыка—Авантура—Гэроіка—Успамін.




**Валянцін Тарас. На высьпе ўспамінаў.** У сваіх мэмуарах, поўных важкіх дэталяў і трапных апісаньняў, пісьменьнік запрашае нас у прастору, дзе жылі Якуб Колас, Уладзімер Караткевіч, Васіль Быкаў, Яўгенія Янішчыц...
Гэта ўнікальны летапіс быцьця душы, што праходзіць праз вайну і мір, жыцьцё і сьмерць, сяброўства і здраду, напісаны паўзьверх старонак гісторыі СССР, Эўропы, Беларусі...

шукайце ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў




**Каляндар на 2008 год**

**са здымкамі фатографаў «НН» Юліі Дарашкевіч і Андрэя Лянкевіча.**




**Пётра Краўчанка. Беларусь на ростанях:** Нататкі дыплямата і палітыка




**Андрэй Дынько, Андрэй Скурко. Беларусь за 10 падарожжаў.** Кніга падарожных эсэ.




**Павал Севярынец. Лісты зь лесу.** У кнзе сабраныя лісты, якія Павал Севярынец ад верасьня 2005 да ліпеня 2007 дасылаў у «Нашу Ніву» з Малога Сітна — месца сваёй высылкі.




**Пётра Рудкоўскі. Паўстаньне Беларусі**

сэрыя заснаваная ў гонар 100-годзьдзя «Нашай Нівы»

# Зьміцер Хведарук: «Пасьля выздараўленьня пайду ў трэнажорку»

Зьміцер Хведарук працягвае знаходзіцца ў дзявятым клінічным шпіталі, што на вуліцы Сямашкі. Сюды яго прывезьлі 12 сьнежня вечарам: хлопца зьбілі амонаўцы падчас акцыі ў абарону незалежнасьці Беларусі. Зьміцер больш за гадзіну быў непрытомны.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У 314-й палаце, дзе ляжыць Хведарук, я засьпеў ягоную маці Ірыну, а таксама сябра і паплечніка Яраслава Грышчэню з Баранавічаў. Ярык сам нядаўна выпісаўся з бальніцы, у яго быў пералом хрыбта пасьля аўтамабільнай аварыі. Цяпер вось прыехаў падтрымаць сябра, хаця і сам пачувае сябе яшчэ ня вельмі добра. Сьпіна дагэтуль баліць.

Хведарук, убачыўшы нас, адразу пачынае ўсьміхацца, нешта жартаваць. Маці, гледзячы на сына, таксама ўсьміхацца: «Што табе казалі ў Белым доме? Каб быў больш сур'ёзны, а ты зноў сьмяесься», — кажа маці. Яна прыяжджае ў шпіталь штодня. Расказвае колькі страху нацярпелася ў першыя гадзіны, калі толькі даведалася пра зьбіцьцё.

Зьміцер кажа, што пачувае сябе значна лепей: «Сёньня нават падымаюся з ложка. Выходзіў з камэры… Ой, прабачце, з палаты, трымаючыся за сьценкі. Самастойна хадзіць пакуль не магу, сядзець таксама доўга не магу, бо робіцца млосна. Ноччу ня вельмі добра сьпіцца, баліць галава. Спадзяюся, што праз пару дзён усё пройдзе, і мне палепшае».

Дару Зьмітру новыя выданьні з сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва», але маці адразу забірае кнігі сабе: чытаць сыну дактары катэгарычна забаранілі. Пасьля зьбіцьця ў хлопца пагоршыўся зрок, ад чытаньня баляць вочы. Лекары дакладна не паставілі дыягназу. Пытаюся, ці памятае Зьміцер тое здарэньне?

«Памятаю хлопца, у якога амонаўцы спрабавалі забраць расьцяжку. Я стаяў побач, і хацеў яму дапамагчы. Не пасьпеў азірнуцца, як мяне моцна схапілі за куртку, выцягнулі з натоўпу і пачалі біць. Прычым білі своеасаблíва — адкрытымі далонямі, падушачкамі на руках. Спачатку білі па скронях, пасьля я паваліўся і мяне пачалі зьбіваць нагамі. Страціў прытомнасьць. Адзін раз прыйшоў у сябе, убачыў перад сабой Міколу Статкевіча, але праз імгненьне зноў праваліўся. Канчаткова ачуняў толькі ў шпіталі. Доўга ня мог размаўляць, бо балела ў грудзёх».

Зьміцер не выключае, што зьбіцьцё можа быць зьвязанае зь ягоным нядаўнім візытам у Вашынгтон. «Мяне вельмі ўразіў Буш. Ён падаўся вельмі простым чалавекам, які прымаў нас фактычна на роўных. Ніяк не спрабуючы паставіць сябе вышэй за нас. Шмат цытаваў Біблію, а таксама паабяцаў штопятніцу маліцца за Беларусь».

Яраслаў Грышчэня і спадарыня Ірына ўжо сабраліся сыходзіць. Зьміцер кажа, што сёньня было няшмат людзей. У пятніцу гасьцей спрабавала разагнаць міліцыя. У пакой заходзілі па чарзе. Фактычна першымі, хто прыехаў у бальніцу пасьля зьбіцьця былі прадстаўнікі амэрыканскага пасольства. Пазьней асабіста прыяжджала пасол ЗША Карэн С'юарт і славацкі дыплямат Любамір Рэгак. Прыяжджалі амаль усе палітычныя лідэры — Анатоль Лябедзька, Павал Севярынец, Лявон Баршчэўскі, Вінцук Вячорка, Анатоль Ляўковіч. Гэта ня кажучы пра сяброў з «Маладога фронту». Наста Палажанка падарыла Зьмітру плюшавага Чабурашку, на якім хлопец цяпер і сьпіць, бо падушкі ня вельмі зручныя.

Зьміцер сьмяецца, што сядзець у камэры на Акрэсьціна весялей: «Можна пагаварыць з кім, пасьмяяцца, пачытаць газэты ці кніжкі, а тут толькі ляжы ўвесь час». Хведарук шкадуе, што праз гэтае здарэньне ня зможа патрапіць на суд да Артура Фінькевіча 20 сьнежня. Даехаць да Магілёва ён пакуль ня ў стане.

У сераду хлопца ўжо мусяць выпісаць. Адкуль такая сьпешка? Аказваецца, што аддзяленьне шпіталю зачыняюць і з гэтай нагоды ўсіх, каго можна, да 20 сьнежня спрабуюць выпісаць, каб не перавозіць у іншыя мэдустановы.

Пытаюся, ці не адбілі жаданьне ўдзельнічаць у акцыях. Зноў усьміхаецца: «Не, нават нейкі азарт разгарэўся. Пасьля выздараўленьня пайду ў трэнажорку, каб троху накачацца».

**Зьміцер Панкавец**

# Кабы чаго ня выйшла

Гарадзенскія ідэолягі зьнялі рэкляму беларускіх садкоў у тралейбусах.

Рэклама беларускамоўных групаў у дзіцячых садках, што некалькі дзён гучала ў гарадзенскім транспарце, спынілася, бо «знаходзіцца на ўзгадненьні ў гарвыканкаме».

Аддзел адукацыі Гарадзенскага гарвыканкаму разам з раённымі адміністрацыямі пайшоў насустрач Бацькоўскаму камітэту ў справе арганізацыі беларускамоўных групаў у дзіцячых садках. Пасьля сустрэчы з прадстаўніком гарадзкой адміністрацыі Бацькоўскі камітэт распачаў інфармацыйную кампанію: ад 10 сьнежня ў гарадзенскіх тралейбусах загучала рэклама беларускамоўных дзіцячых садкоў. Але гучала яна толькі да серады 12 сьнежня. Паводле неафіцыйнай інфармацыі, рэклямай «зацікавіліся» чыноўнікі ідэалягічнага аддзелу гарвыканкаму.

Адзін з актывістаў Бацькоўскага камітэту Ігар Кузьмініч быў запрошаны ў панядзелак 17 сьнежня ў гарвыканкам: «Я сустракаўся з загадчыкам аддзелу адукацыі Гарадзенскага гарвыканкаму Сяргеем Блажэем, ён на 100 адсоткаў запэўнівае, што гарвыканкам не здымаў рэкляму у транспарце». Пры гэтым чыноўнік адзначыў, што ў любым разе рэкляму трэба ўзгадняць у аддзеле адукацыі, бо гаворка ідзе пра дзяржаўныя садкі. Цяпер тэкст рэклямы знаходзіцца на ўзгадненьні ў сп.Блажэя. «Тое, як хутка рэклама ізноў зьявіцца ў тралейбусах, будзе паказчыкам, наколькі ўлады гатовыя нам дапамагаць», — мяркуе І.Кузьмініч. Паводле яго, у часе сустрэчы ўсе ягоныя прапановы былі выслуханыя і нават дапоўненыя. На сёньня існуе магчымасьць стварэньня не аднай разнаўзроставай, а дзьвюх паўнавартасных групаў, што можа закласьці падмурак для ўтварэньня беларускамоўнай клясы. «Цяпер справа за намі, улады выказалі гатоўнасьць стварыць пры патрэбе групу зь беларускамоўным навучаньнем і ў іншых раёнах гораду, калі будзе набраная неабходная колькасьць дзетак», — сказаў сп.Кузьмініч.

**Сямён Печанко**

# Мілінкевіч паслам: падтрымайце Фінькевіча

З просьбай падтрымаць аднаго зь лідэраў незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт» Артура Фінькевіча зьвярнуўся 17 сьнежня да паслоў замежных краінаў Аляксандар Мілінкевіч.

20 сьнежня ў Магілёўскім судзе распачнецца новы працэс супраць палітвязьня. А.Фінькевічу прад’яўленае абвінавачаньне паводле арт. 415 КК (ухіленьне ад пакараньня ў выглядзе абмежаваньня волі). Яму пагражае да трох гадоў пазбаўлення волі.

«Артур Фінькевіч — гэта высокамаральны малады чалавек, — піша ў сваім звароце А.Мілінкевіч. — Ён апынуўся за кратамі толькі за тое, што скарыстаўся сваім правам на свабоду выказваньня ».

А.Мілінкевіч просіць замежныя ўрады «праявіць салідарнасьць зь Фінькевічам» і «прыняць адпаведныя захады дзеля ўзьдзеяньня на ўлады Беларусі ».

20 сьнежня палітык плянуе прыехаць у Магілёўскі суд (вул.Дабралюбава, 2) для назіраньня за працэсам, што распачнецца а 10-й.

**Буг; БелаПАН**

### Каго ня пусьцяць за мяжу

У банк зьвестак пра грамадзянаў Беларусі, якім часова абмежавана права на выезд з краіны, уключаныя шэсьць катэгорыяў асобаў, паведамляе БЕЛТА. Гэта грамадзяне:

— інфармаваныя аб зьвестках, што складаюць дзяржаўную таямніцу;

— падазраваныя або абвінавачваныя паводле крымінальнай справы, — да спыненьня крымінальнага перасьледу;

— асуджаныя за ўчыненьне злачынства, да выкананьня пакараньня або вызваленьня ад пакараньня;

— якія ўхіляюцца ад выкананьня абавязацельстваў, накладзеных на іх судом, напрыклад, неплацельшчыкі аліментаў;

— якім прад’яўлены пазоў у судзе, — на тэрмін, устаноўлены судом;

— якія ўхіляюцца ад службы ў войску.

## СЬЦІСЛА

### Зьменшаны падатак з падпрацовак

З наступнага году падаходны падатак па неасноўным месцы працы будзе зьніжаны з 20% да 15%. Гэта прадугледжана зьменамі ў законы аб падаткаабкладаньні.

### Мова пад пагрозай выкіданьня з ВНУ

Таварыства беларускай мовы выступае супраць вываду курсу прафэсійнай лексыкі беларускай мовы з навучальных праграмаў ВНУ і мае намер гэтаму супрацьстаяць. Пра гэта заявіла намесьніца старшыні ТБМ Людміла Дзіцэвіч.

### «Беларусь у Раду Эўропы — пры ўмове свабоды друку»

Пра гэта заявіў у інтэрвію радыё «Свабода» генэральны сакратар Рады Эўропы Тэры Дэвіс.

«Беларусь зьвярталася з просьбай аб далучэньні да Рады Эўропы. Але разгляд яе звароту быў спынены, бо яна не выконвала стандарты дэмакратыі, правоў чалавека і вяршэнства закону. Мы выказваем шкадаваньне з гэтай нагоды, бо Беларусь — адзіная краіна ў Эўропе, якая не ўваходзіць у Раду Эўропы. Каб далучыцца да Рады Эўропы, Беларусь павінная мець свабоду друку, павінная быць магчымасьць распаўсюджваць газэты, якія крытыкуюць прэзыдэнта Беларусі. Будзе таксама добрым крокам, калі скасуюць сьмяротнае пакараньне, Беларусь — адзіная краіна ў Эўропе, якая ўсё яшчэ мае сьмяротнае пакараньне», — сказаў Дэвіс.

**Буг**

# Цімашэнка мае намер перагледзець газавыя пагадненьні з Расеяй

Аднак нестабільнасьць яе ўраду можа зьвязаць ёй рукі.

Новая прэм’ер-міністарка Ўкраіны Юлія Цімашэнка мае намер ініцыяваць перамовы з Расеяй у газавай сфэры. Такую заяву яна зрабіла журналістам у аўторак, 18 сьнежня, адказваючы на пытаньні пасьля заканчэньня працы парлямэнту.

«Мы будзем ініцыяваць сустрэчу з нашымі расейскімі калегамі, каб высьветліць усе пытаньні, датычныя паставак газу ва Ўкраіну і яго транзыту», — паведаміла яна.

Новая прэм’ерка заявіла, што Ўкраіна застаецца надзейнай транзытнай дзяржавай. Паводле яе, «для краінаў ЭС Украіна будзе надзейным партнэрам». «Мы не сарвем аніводнага аб’ёму, аніводнага тэрміну», — падкрэсьліла Ю. Цімашэнка.

«Усе газавыя пытаньні будуць дэталёва разабраныя, прааналізаваныя ўсе пагадненьні, якія былі закрытымі», — адзначыла Ю. Цімашэнка. «Мая пазыцыя застаецца нязьменнай: пасярэднікаў на газавым рынку быць не павінна», — адзначыла старшыня ўраду. Згодна зь ёй, з аднаго боку ёсьць «Нафтогаз Украіны», з другой — ААТ «Газпром», і ёсьць урады абедзьвюх краінаў, таму пасярэднікаў тут быць не павінна.

Раней лідэр БЮТ ужо не аднойчы заяўляла, што мае намер прыбраць кампанію RosUkrEnergo як пасярэдніка пры продажы расейскага газу Ўкраіне. Пры гэтым Ю. Цімашэнка спасылалася на меркаваньне старшыні рады дырэктараў «Газпрому» Дзьмітрыя Мядзьведзева, які яшчэ на пачатку кастрычніка гэтага году выказаў гатоўнасьць прыбраць RosUkrEnergo з дачыненьняў паміж Украінай і РФ. Віну за тое, што гэта да гэтай пары ня зроблена, палітык усклала на экс-прэм’ера Віктара Януковіча.

Ю. Цімашэнка падкрэсьліла, што за «правал энэргетычнай палітыкі і спрыяньне карупцыі ў энэргетыцы гэтай камандзе давядзецца адказваць». RosUkrEnergo яна назвала «пляцоўкай для разьмеркаваньня хабару» і звышпрыбыткаў.

Цяпер пастаўшчыком усяго газу ва Ўкраіну зьяўляецца швайцарскі трэйдэр RosUkrEnergo (50 % — у «Газпрому», 50 % — у Centragas Holding AG).

Нагадаем, што новы кантракт на пастаўкі расейскага газу ва Ўкраіну быў падпісаны 4 сьнежня паміж кіраўніком «Газпрому» Аляксеем Мілерам і міністрам паліва і энэргетыкі Ўкраіны Юр’ем Бойкам. Згодна зь ім, «Газпром» падняў цану на газ для Кіева на 2008 г. з 130 да 179,5 даляра за 1 тыс. куб. м. (зь Беларусі патрабуцюь толькі 119).

Раней, у кастрычніку—лістападзе цана на пастаўляны ва Ўкраіну газ абмяркоўвалася на ўзроўні 160 дал. за 1 тыс. куб. м. Такую цану як прымальную называла Ўкраіна. Аднак 27 лістапада стал вядома, што Туркмэнія значна падняла цану на газ, што закупляе і пасьля перапрадае «Газпром».

Згодна з новымі дамоўленасьцямі, «Газпром» будзе купляць у Туркмэніі газ у першым паўгодзьдзі 2008г. па $130 за 1 тыс. куб. м, у другім — ра $150 за 1 тыс. куб. м замест $100 за 1 тыс. куб. м у рамках падпісаных раней кантрактаў. Павышэньне закупнай цаны туркмэнскага газу для «Газпрому» мела вынікам павышэньне цаны для Ўкраіны.

Цімашэнка выйграла галасаваньне ў Радзе зь мінімальнай перавагай, набраўшы 226 галасоў з 450. Яе ўрад будзе крохкай канструкцыяй, перш за ўсё праз супэрніцтва яе з прэзыдэнтам Ючшанкам за лідэрства ў празаходнім сэгмэнце палітыкуму. Характэрна, што блізкі да Ючшанкі старшыня Рады бясьпекі і абароны Ўкраіны і вэтэран украінскай палітычнай сцэны Іван Плюшч так і не прагаласаваў за Цімашэнку, а іншы блізкі сябар Ючшанкі, экс-прэм’ер і навапрызначаны міністар абароны Юры Еханураў зрабіў гэта ў самы апошні момант. Дагэтулешні ж міністар абароны Анатоль Грыцэнка заявіў, што ад Ючшанкі болей ня прыме ніякай пасады. Гэта прытым, што менавіта ягоная падтрымка ў многім абумовіла перамогу Ючшанкі ў барацьбе за роспуск парлямэнту.

**Буг; НБ; крыніцы ў Інтэрнэце**

## СЬЦІСЛА

### Тры кандыдаты ў прэзыдэнты Расеі ад лібэралаў

Кандыдатам ад Саюзу правых сілаў 17 сьнежня вылучаны былы віцэ-прэм’ер ураду Расеі Барыс Нямцоў. Зараз да 16 студзеня СПС за свайго кандыдата трэба сабраць ня менш за 2 млн подпісаў. Пасьля адмовы Яўлінскага і Каспарава ад удзелу ў кампаніі, застаюцца толькі тры лібэральныя прэтэндэнты: былы прэм’ер Міхаіл Касьянаў і дысыдэнт Уладзімер Букоўскі, які ад 1976 году жыў на Захадзе. Яны прысягаюць, што будуць каардынаваць свае дзеяньні. Дагэтуль антыаўтарытарным сілам у Расеі не ўдавалася стварыць прыцягальную альтэрнатыву.

### Пуцін даў згоду

Праясьняецца пасьлявыбарчая канструкцыя ўлады ў Расеі. Пуцін заявіў, што пагодзіцца стаць прэм’ер-міністрам у выпадку абраньня Дзьмітрыя Мядзьведзева кіраўніком дзяржавы. Ён заявіў пра гэта ў панядзелак на зьезьдзе партыі «Адзіная Расея».

### Мінімальны заробак у Літве 338 даляраў

Са студзеня мінімальны заробак у Літве складзе 800 літаў, або 338 даляраў. Сёньня мінімальны заробак у Літве — у сьнежні 700 літаў — атрымлівае 14% працаўнікоў.

### У парлямэнт Кіргізіі прайшлі тры або чатыры партыі

Чатыры партыі адолелі 5-працэнтавы бар’ер на першых у гісторыі краіны выбарах паводле прапарцыйнай сыстэмы: прэзыдэнцкая «Партыя ўлады» «Ак Жол» (47% галасоў), партыя празаходняй апазыцыі «Ата Мекен» (8,3%), «Партыя камуністаў» (5,1%), «Сацыял-дэмакратычная партыя» (5,1%). Праўда, дадатковыя кручкі ў заканадаўстве могуць пазбавіць «Ата Мекен» месцаў у парлямэнце.

### Незалежнасьць Косава непазьбежная

Лідэры краінаў Эўрасаюзу дасягнулі прынцыповай згоды наконт адпраўкі місіі ў складзе 1800 чалавек у Косава ў выпадку абвяшчэньня краем незалежнасьці. Выступаючы на саміце ЭС, Сарказі сказаў, што незалежнасьць Косава непазьбежная.

**Буг**

## 11 сьнежня

### Казуліну пазбавілі правоў

Дачку экс-кандыдата ў прэзыдэнты Аляксандра Казуліна Вольгу пазбавілі правоў і ааштрафавалі за «парушэньне правілаў дарожнага руху». **Вольга Казуліна** была затрыманая супрацоўнікамі міліцыі, калі яна праяжджала ўзбоч Кастрычніцкай плошчы. Яна прасыгналіла ўдзельнікам мітынгу прадпрымальнікаў. Апроч усяго, да шкла аўтамабіля быў прылеплены партрэт яе бацькі. Вольгу пратрымалі каля чатырох гадзінаў у пастарунку, пасьля чаго выпусьцілі.

### Баранавіцкіх адпусьцілі

Баранавіцкія юнакі **Вадзім Аўраменка**, **Вадзім Логіш** і **Павал Крываносаў** былі затрыманыя за распаўсюд улётак. Міліцыянты даставілі юнакоў у апорны пункт і сканфіскавалі друкаваную прадукцыю. Паколькі Аўраменка і Логіш — непаўналетнія, а Паўлу Крываносаву толькі некалькі дзён таму споўнілася 18 гадоў, іх адпусьцілі без складаньня пратаколу.

## 12 сьнежня

### Звольнены за Парфяновіча

Кіраўнік агенцтва «Мінск-навіны» **Рыгор Новікаў** звольнены з працы за інтэрвію з Уладзімерам Парфяновічам, надрукаванае ў пачатку сьнежня ў газэце «Минский курьер». Афіцыйна заяўляецца, што Рыгор Новікаў сышоў з пасады «з агульнай згоды бакоў».

### У Гомелі затрымалі прадпрымальніцу

У Гомелі затрыманая прадпрымальніца **Ірына Камінская**. Па дарозе ў суд жанчыне стала дрэнна. Раней Ірыну Камінскую затрымлівалі 30 лістапада ў вёсцы Урыцкая, калі ў яе сканфіскавалі 280 асобнікаў улётак пра акцыю прадпрымальнікаў. Па стане здароўя паседжаньне суду перанесьлі на панядзелак, 17 сьнежня.

## 13 сьнежня

### Пуцін, гоў хоўм!

Увечары пара дзясяткаў маладых людзей выйшлі на Нямігу з расьцяжкай «Путин, Go Home!». Яны трымалі бел-чырвона-белы, чырвона-зялёны, эўрасаюзаўскія сьцягі, а таксама сьцягі Менску, скандавалі «Незалежнасьць!», «Жыве Беларусь!», «Не — саюзу з Расеяй!», «Тут вам не Расея» і рвалі партрэты Пуціна. Праз дзесяць хвілінаў пасьля пачатку акцыі пад'ехаў аўтазак. Былі затрыманыя 15 чалавек.

### Жураўлікі свабоды

Тысячы жураўлікаў, падрыхтаваных Міжнароднай праваабарончай арганізацыяй «Міжнародная амністыя» дзеля свабоды Зьмітра Дашкевіча, перадалі ў МУС.

### Не прызнаюць зьбіцьця Хведарука

У міліцыі адмовіліся прымаць заяву Ірыны Хведарук наконт зьбіцьця яе сына Зьмітра Хведарука падчас акцыі ў абарону незалежнасьці Беларусі. Міліцыянты спасылаліся на тое, што паводле заканадаўства заяву павінныя накіраваць мэдыкі, бо пацярпелы быў дастаўлены ў бальніцу машынай хуткай дапамогі.

### У Берасьці арышты за Пуціна

Спэцназ затрымаў ля будынка Генэральнага консульства Расеі ў Берасьце некалькі грамадзкіх актывістаў. Маладзёны трымалі ў руках плякат: «Тату, тату, лезе маскаль у хату», «Ніякіх саюзаў з Расеяй!» і скандавалі «Пуцін — дамоў!» У кароткі час ля консульства зьявіліся два аўтамабілі міліцэйскага спэцназу. Затрыманыя **Наста Ільіна** і **Андрэй Шарэнда**. Ім далі па 7 сутак арышту.

## 14 сьнежня

###Ператрусы ў сваякоў

Супрацоўнікі КДБ правяліператрусы ў сваякоў сябраў гомельскай арганізацыі «Аб'яднанай грамадзянскай партыі». Шукалі на дачах і ў дамах актывістаў улёткі да 16 сьнежня і капіравальную тэхніку. Сканфіскаваныя невялікія наклады малафарматных газэтаў «Свабода», «Калінка», некалькі ўлётак у абарону Зьмітра Дашкевіча, плякат «Дзе Захаранка?», а таксама кампакт-дыскі і дзелавыя паперы. Супрацоўнікі спэцслужбаў правялі вобшукі ў сваякоў сябраў АГП **Уладзімера Кацоры**, **Зінаіды Шумілінай**, **Леаніда Судаленкі**.

### Жалезьнічэнка перамог

Гомельская абласная судовая калегія па грамадзянскіх справах пад старшынствам **Элеаноры Буянковай** разгледзела скаргу адлічанага з Гомельскага дзяржуніверсытэту актывіста **Зьмітра Жалезьнічэнкі** і адмяніла рашэньне суду Цэнтральнага раёну аб адмове ў задавальненьні скаргі на дзеяньні адміністрацыі ВНУ.

### Эўрасаюз асуджае

Старшынства ЭС у Менску асудзіла рэпрэсіўныя дзеяньні беларускіх уладаў 12 сьнежня, скіраваныя супраць мірных дэманстрантаў. Пра гэта гаворыцца ў заяве пасольства Славакіі ў Беларусі.

### КДБ для КДБ

Скаргу гомельскага журналіста, сябра Беларускай асацыяцыі журналістаў **Сяргея Падсасоннага** на неправамерныя дзеяньні КДБ абласная пракуратура скіравала для рэагаваньня ў мясцовы КДБ. 23 лістапада дамоў да журналіста прыйшлі супрацоўнікі ўпраўленьня КДБ па Гомельскай вобласьці, даставілі яго ва ўпраўленьне і апыталі. Пытаньні тычыліся прафэсійнай дзейнасьці журналіста і яго дачыненьня да першага незалежнага беларускага тэлеканалу «Белсат».

### Шылу пакуль адпусьцілі

Бацька моладзевага актывіста **Івана Шылы** наведаў пракуратуру. Па выніках праверкі было прынятае рашэньне не заводзіць крымінальнае справы супраць Івана. Справу маглі распачаць за супраціў работнікам міліцыі.

## 16 сьнежня

### Затрымалі камуніста

Супрацоўнікі міліцыі затрымалі сябра «Партыі камуністаў Беларускай» **Сяргея Абразоўскага**. Адбылося гэта на грамадзкім мітынгу ў пасёлку Дружны. Складзены адміністрацыйны пратакол за парушэньне грамадзкага парадку.

### Пікет у Магілёве

У Магілёве перад будынкам гарадзкога цэнтру культуры і адпачынку прайшоў пікет супраць адмены льготаў. Удзел узялі дзесяць чалавек, якія трымалі ў руках расьцяжкі: «Не пазбаўляйце школьнікаў ільготаў», «Вэтэраны вартыя лепшага жыцьця». Удзельнікі пікету раздавалі мінакам газэту «Товарищ».

## 17 сьнежня

### Мікалай Сергеенка «налаяўся» на 10 сутак

Прысуд вынесла судзьдзя суду Ленінскага раёну Менску **Юлія Шумская**. Міліцыянты на судзе заявілі, што актывіст нібыта нецэнзурна лаяўся на адрас міліцыянтаў у офісе Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў 6 сьнежня.

### Пахаваньне льготаў

Флэш-моб у сувязі з адменай ільготаў правялі ў сталічным мікраёне Зялёны Луг актывісты грамадзянскай кампаніі «За Свабоду!». На прыпынку грамадзкага транспарту, актывісты паставілі «помнік» льготнаму праязному квітку. Вялікі «льготны квіток» быў прымацаваны да мэталічнага слупа, а побач горкай былі складзеныя камяні. Ля «помніка» актывісты паклалі ўлётку, у якой паведамляецца, што з 17 сьнежня беларусы пазбаўляюцца права на льготны праезд. Былым ільготнікам прапануюецца ўшанаваць памяць «заўчасна памёрлых ільготаў».

## 18 сьнежня

### У Гарадку не дазволілі сустрэчу з Арловым

Творчую сустрэчу зь пісьменьнікам Уладзімірам Арловым не дазволілі правесьці ў горадзе Гарадок на Віцебшчыне. Яна была запляванавая на 20 сьнежня ў бібліятэцы. Ліст-адказ з аддзелу культуры быў напісаны на расейскай мове, а прозьвішча пісьменьніка — з памылкай.

**ЗП**




**Аўтуховіч Мікола**
Менск, вул. Кальварыйская 36, ВК-1, а/с 35, атрад 3

**Дашкевіч Зьміцер**
Шклоў, ВК №17
213004 Магілёўская вобласьць

**Казулін Аляксандар**
Віцебскі раён, пас. Віцьба, ВК-3, атрад 1
211300 Віцебская вобласьць

**Клімаў Андрэй Яўгенавіч**
г. Мазыр-11, ВК-20
247760 Гомельская вобл.

**Артур Фінькевіч**
г. Магілёў, 212011
вул Крупскай дом 99а (сьледчая турма №4), камэра 85

# NATO і Беларусь: стратэгічнае партнэрства

Нягледзячы на ўсе ідэалягічныя разыходжаньні і абмежаваныя кантакты сярод высокіх чыноў, простыя сувязі між вайскоўцамі Беларусі і NATO няспынна растуць. Ужо цяпер мы бярэм удзел амаль у сотні супольных мерапрыемстваў. А ў беларускім войску зьявіцца спэцыяльная рота, якая можа браць удзел у міратворчых місіях. Рэпартаж **Зьмітра Панкаўца** з штаб-кватэры NATO.

### Валёнія і Фляндрыя

Брусэль сустрэў нас дробным халодным дажджом. Кажуць, што гэта звычайнае надвор'е для першага зімовага месяца ў Бэльгіі. Дождж церусіў усе тры дні, якія мы знаходзіліся тамака. У сваю чаргу, сонца практычна не было. Самі бэльгійцы з іроніяй расказваюць нам показку: «Эўрапейскія дзеці, калі сабраліся гуляюць разам, пытаюцца ў бэльгійскага хлопчыка, чаму ён такі белы і незагарэлы, хіба ў вас лета няма? Лета, канечне, ёсьць, але акурат той дзень я прахварэў».

Галоўная тэма, якая сёньня бударажыць краіну — гэта магчымы падзел Бэльгіі на Фляндрыю і Валёнію. Фактычна адразу нас папярэджваюць, што ў некаторых крамах могуць зрабіць выгляд, што нас не зразумелі, калі будзем зьвяртацца да прадаўца па-француску. Нягледзячы нават на тое, што Брусэль на 80% франкамоўны горад, геаграфічна — гэта частка Фляндрыі.

Цягам апошніх пяці месяцаў урад ня можа паўнавартасна працаваць акурат праз гэтыя разнагалосьсі між двума народамі. Падзел на флямандцаў і валёнцаў у краіне відавочны. Ужо сёньня не існуе такога панятку, як, скажам, Міністэрства гандлю Бэльгіі, на іх месцы прыйшлі асобныя міністэрствы Фляндрыі і Валёніі.

На пытаньне, дзе канчаецца Валёнія, брусэльскі таксіст адказвае шчыра: «Валёнія — гэта ўся Бэльгія». Думаю, што флямандзец адказаў бы тое самае, толькі пра Фляндрыю.

Наколькі глыбокім можа быць гэты раскол і чым ён скончыцца, пакуль не бярэцца гадаць ніхто. Пакуль сытуацыю ратуе кароль, які не зьяўляецца ні валёнам, ні флямандцам.

Нягледзячы на гэта, на кожным пятым доме вісяць дзяржаўныя бэльгійскія сьцягі. У Менску такога ня ўбачыш і блізка.

### Калядная атмасфэра

Проста пад вокнамі гатэлю, які разьмешчаны за пяць хвілінаў хады ад цэнтральнай плошчы гораду, раскінуўся калядны кірмаш. У дзясятках шапікаў прадаюцца самыя розныя рэчы — ад брусэльскіх сувэніраў у выглядзе гадзіньнікаў да карцін мясцовых мастакоў. Працуе кірмаш аж да дзясятай вечара, тады як большасьць звычайных крамак зачыняюцца ўжо а шостай вечара — каталіцкая краіна!

На кірмашы заўсёды можна паласавацца стравамі розных кухняў сьвету — аргентынскай, турэцкай, пакістанскай, гішпанскай. Між шэрагаў блукаюць нейкія джазавыя музыкі, якія сваёй жыцьцярадаснай музыкай уздымаюць усім настрой, а таксама звычайныя махляры і зладзеі. Апошніх таксама дастаткова шмат.

Тамсама залітая коўзанка. Нават калі зь вечара ліў дождж, і каток ператвараўся ў сапраўднае балота, то назаўтра ён ужо быў у надзвычай добрым стане. І калі толькі пасьпяваюць?

На цэнтральнай Гранд-Пляс увесь час гучыць музыка. Мясцовыя майстры ладзілі лязэрныя шоў на сьцяне гарадзкой ратушы. Гучыць і опэрная музыка, і клясыка сусьветнага рок-н-ролу. Калядная ялінка, здаецца, упрыгожаная менш за менскую, але ад гэтага зусім не прайграе.

На гэтым самым пляцы стаяць ясьлі, зь дзіцяткам Ісусам. У загарадцы бегаюць дзьве жывыя авечкі. А яшчэ скрозь прадаецца шакаляд і піва. Знаўцы кажуць, што апошняга тут нават болей, чым у Нямеччыне.

### Зялёныя папугаі NATO

Галоўнай мэтай нашага візыту зьяўлялася наведваньне структураў NATO. Цэнтральны офіс альянсу асабліва не ўразіў сваім размахам. Чакалі ўбачыць магутную шматпавярховую спаруду, а на яе месцы аказаўся цэлы квартал невялікіх шэрых будынкаў. «Нагадвае нашы абшчагі», — пажартаваў нехта з дэлегацыі. Унутры таксама мінімалісцкі стыль.

Пры ўваходзе — пільны надгляд кожнага. Адразу забіраюць фотаапараты і дыктафоны. Кажуць, што нельга, але абяцаюць дазволіць кожнаму сфатаграфавацца ля вядомага НАТАЎскага сымбалю. Не падманулі.

Яшчэ на тэрыторыі офісу NATO ў Брусэлі жывуць зялёныя папугаі, як яны там зьявіліся і як выжываюць у ня самыя цёплыя бэльгійскія зімы для ўсіх загадка. На двух дрэвах сядзяць каля сотні такіх птушак. Ніхто выганяць іх адсюль не зьбіраецца, яны ўжо сталі сапраўднымі сымбалямі арганізацыі.

Унутры офісу нас адразу папярэджваюць, што ўсе размовы тутака будуць мець паўафіцыйны характар. Нельга цытаваць нікога з суразмоўцаў. Можна толькі пісаць наступнае: «Як паведамілі нам у офісе NATO ў Брусэлі…». Афіцыйную пазыцыю Паўночнаатлянтычнага альянсу можа выказваць толькі генэральны сакратар арганізацыі Яап дэ Хооп Схефэр ці нехта з прэс-сакратароў.

10 сьнежня, калі мы акурат знаходзіліся ў NATO, павінен быў вырашацца далейшы лёс Косава. Амаль кожны суразмоўца паўтараў




**Беларускія і польскія інжынэрныя войскі будуюць пантонны мост у рамках супрацы Беларусі і NATO. Гарадзеншчына.**

адну і тую ж фразу: «Косава — гэта не Швайцарыя, але, каб ня NATO, там было б яшчэ горш…». Часта згадваюць пра Аўганістан, крыху радзей пра Ірак. Аднак, як падаецца, найбольш функцыянэраў альянсу цікавіць, як можа пайсьці разьвіцьцё адносін з Расеяй, калі сыстэмы ПРА будуць усталяваныя ў Польшчы і Чэхіі. Ці ня можа гэта азначаць канчатковы разрыў з нашай усходняй суседкай?

## Стратэгічнае партнэрства

Беларусь — адна з 49 краінаў сьвету, якія не ўваходзяць у NATO, але маюць з блёкам партнэрскія адносіны. Наша супраца адбываецца ў рамках Рады эўрапейска-атлянтычнага супрацоўніцтва і праграмы «Партнэрства дзеля міру». У офісе арганізацыі ўвесь час падкрэсьлівалі, што кантакты з нашай краінай працягваюць узрастаць і павялічвацца, але ў сілу «ўсім вядомых абставін», яны ня могуць разьвівацца так інтэнсіўна, як хацелася б абодвум бакам. «Беларусь — гэта, хутчэй, выключэньне з правілаў партнэрства блёку», — казалі ў NATO.

Летась канадзкія вайскоўцы скончылі ў Беларусі рэалізацыю мэтавага фонду NATO, які накіроўваўся на зьнішчэньне 700 тысяч супрацьпяхотных мін у нашай краіне. Абяцаюць, што гэтая праграма не апошняя, бо падобных мін у Беларусі яшчэ засталося досыць многа.

У офісе адзначаюць, што мінулыя прэзыдэнцкія выбары ў нашай краіне прымусілі арганізацыю пераглядзець узаемаадносіны зь Беларусьсю. Яап дэ Хооп Схефэр тады рэзка скрытыкаваў дзеяньні беларускіх уладаў, арышты і разгон дэманстрантаў. Разглядаўся нават варыянт поўнага спыненьня сувязяў зь Беларусьсю, але ўрэшце палічылі, што такое разьвіцьцё падзей было б неразумным і не прынесла б нікому карысьці.

Налета ў лютым Беларусь маюць наведаюць прадстаўнікі Міжнароднага сакратарыяту NATO. Плянуецца, што падчас візыту будзе абмеркаваная рэформа беларускага вайсковага комплексу. Прынамсі, гаворка пойдзе пра стварэньне ў беларускім войску ротаў, якія б маглі ўдзельнічаць у міратворчых місіях NATO. Размова пакуль ня ідзе пра сам удзел, а толькі пра элітныя часткі, якія ў выпадку чаго маглі браць удзел у такіх апэрацыях. На сустрэчы таксама будзе весьціся пра абмен досьведам ва ўдзеле ў міжнародных місіях і міжнароднага супрацоўніцтва.

Яшчэ адзначалася, што энэргетычная бясьпека можа стаць адным з пунктаў супрацы Беларусі і NATO. «Было некалькі непрыемных момантаў з боку Расеі», — зазначылі ў NATO.

«Дыялёг з вашай краінай сёньня вельмі жорсткі, але гэта лепш за ізаляцыю», — казалі NATO. Нягледзячы на ўсе ідэалягічныя разыходжаньні і абмежаваныя кантакты сярод высокіх чыноў, простыя сувязі між вайскоўцамі Беларусі і NATO няспынна растуць. Кантакты адбываюцца на ўзроўні намесьніка абароны Беларусі ці палкоўнікаў. Толькі летась нашы вайскоўцы супольна з NATO правялі больш сотні сумесных мерапрыемстваў. Штогод гэты паказьнік расьце. Альянс стала праводзіць мерапрыемствы для нашых вайскоўцаў і прадстаўнікоў Міністэрства па надзвычайных сытуацыях.

**Брусэль — Менск**

# Пас Вітаўта на Маркса

У Гістарычным музэі будзе выстаўлены пас Вітаўта. Завяршэньне атрымала адна з самых гучных справаў апошняга часу, зьвязаная з нацыянальным скарбам.



Са студзеня ў Нацыянальным музэі гісторыі й культуры будзе адкрытая выстава «З крыніц адвечнай прыгажосьці». На ёй, сярод іншых унікальных рарытэтаў з фондаў музэю, будзе прадстаўлены славуты «Пас Вітаўта». Гэты шэдэўр ювэлірнага мастацтва з Крыму быў знойдзены ў пачатку 1990-х пры раскопках ля вёскі Літва пад Маладэчнам.

Пас — падарунак хана Хаджы-Гірэя вялікаму князю Вітаўту — датуецца XIV ст. і складаецца з 11 срэбных, пазалачоных паясных бляхаў, адной срэбнай спражкі, аднаго срэбнага наканечніка ўсходнякрымскага паходжаньня.

Упершыню «Пас Вітаўта» стаў ведамы навукоўцам у 1994 г. Яго з мэтай продажу прынёс у Нацыянальны музэй гісторыі і культуры жыхар Крупак, былы вайсковец ды калекцыянэр з 20-гадовым стажам Антон Грыбаў. Цікава, што пас быў занесены ў Дзяржаўны рэестар гісторыка-культурных каштоўнасьцяў найвышэйшае катэгорыі і 11 гадоў знаходзіўся ў прыватных руках.

У лістападзе 2005 г. аўкцыённы дом «Paragis» паведаміў сэнсацыю: на таргі выстаўляецца пас вялікага князя літоўскага Вітаўта, стартавая цана — 80 тыс. у.а.

Высьвятленьнем лёсу паса заняўся прафэсар катэдры археалёгіі гістарычнага факультэту БДУ Валянцін Рабцэвіч. Ён пачаў высьвятляць рэальнае паходжаньне гэтага ўнікальнага артэфакту й абставіны яго «прыватызацыі». Згодна з адказам з Камітэту па ахове гістарычнай спадчыны, «камплект срэбранага пояса першай трэці XV ст. знаходзіцца ва ўласніка «Група СТС» з выкананьнем усіх неабходных ўмоваў захоўвання, прадугледжаных Законам Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны». Сп. Рабцэвіч высьветліў, што скарб быў выпадкова знойдзены падчас работаў ля вёскі Літва Маладэчанскага раёну. Увесь ён быў парасьцяганы. Куды патрапілі іншыя рэчы, невядома.

Высьветлілася, што А.Грыбаў ужо здаў рэліквію ў вытворчае прадпрыемства «Саюзтэхсэрвіс». На момант продажу рэліквія была ацэненая экспэртамі ў 80—100 тыс. даляраў, а прыдбаў яго «Саюзтэхсервіс» усяго за 5 тысячаў, хоць артыкул № 70 закону «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» забараняе «перадаваць (прадаваць, дарыць) матэрыяльныя каштоўнасьці ва ўласнасьць ці карыстаньне замежным юрыдычным ці фізычным асобам». Але прадпрыемства «Саюзтэхсэрвіс» (пазьней «Група СТС», а сёньня ўжо проста «Група»), што «купіла» нашую рэліквію — фірма з цалкам расейскім капіталам.

Пасьля быў суд. Унікальны срэбраны «Пас Вітаўта», ціха й незаўважна для грамадзтва, рашэньнем Вярхоўнага суду накіраваны ва ўласнасьць беларускай дзяржавы. Гэтак шэдэўр ювэлірнага мастацтва зноў мае заняць сваё пачэснае месца.

У студзеньскай экспазыцыі «З крыніц адвечнай прыгажосьці» будуць таксама ўнікальныя манэты, рэчавыя скарбы, творы ювэлірнага й дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва. Цяпер у гэтай беларускай скарбніцы зьберагаецца звыш 350 тысячаў экспанатаў. Выстава будзе трываць больш за год.

Застаецца пакуль невядомым, куды падзеліся іншыя рэчы зь «Літоўскага скарбу»...

**СХ**

# Дзякуй за падтрымку

**Сяргею Л., Веры Ч., Ірыне Я., Пятру Б., Лілії В.** зь Берасьця.

**Валянціне С., Антону Т., Аляксандру Ш., Андрэю Р., Лілії З., Лявону Л., А.Г., Зоі Д., А.С.** зь Менскага раёну.

**Любові Ш., Эдуарду М.** зь Віцебску.

**Георгію С.** з Воршы.

**Андрэю К., Алегу Дз., Аляксею Б.** з Магілёва.

**Аркадзю М., Васілю К., Аляксандру М.** з Гомелю.

**Анатолю Б., Лізавеце К.** з Маладэчна.

**Алесю Б., Сяргею С., Валеру П.** з Баранавічаў.

**Н.Х.** са Шчучынскага раёну.

**Юр'ю Б.** з Кобрыньскага раёну.

**Андрэю Ч.** з Рагачоўскага раёну.

**Леаніду А.** з Гарадоцкага раёну.

**Соф'і Л.** з Клічаўскага раёну.

**Антону М.** з Полацкага раёну.

**Аляксандру Н.** са Жлобінскага раёну.

**Валеру І.** з Салігорскага раёну.

**Віктару Т.** з Лагойскага раёну.

**Леакадзіі Н.** з Валожынскага раёну.

**Галіне Л., Віктару П., Я.Ч.** з Горадні.

**С.П., Міхаілу Ш., Раману М., Марыі Г., Л.Ш., А.Л., Вользе А., М.Ц., Вользе Ш., Сьвятлане В., Лідзіі І., Н.К., Галіне К., Генадзю В., В.Л., А.Л., С.А., Л.Г., Сяргею Ж., Вользе К., Казімеру Г., Т.В., Т., Анатолю Г., Сьвятлане Ш., Леаніле Г., Уладзімеру З., Міхаілу Б., Але К., Пятру Р., Людміле І., Натальлі Б., Эрнэсту Г., Яўгену Ш., П.Б., А.М., С.Ш., В.Ш., Т.П., Рагнедзе А., Уладзімеру С., Андрэю В., А.М., І.Л.** зь Менску.

**Рыбін горад: Раман / Наталка Бабіна. — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2007. — 312 с. («Кнігарня «Наша Ніва»)**




ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перақазу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Па пытаньнях атрыманьня газэты пытайцеся Рамана.

## 20 даляраў за месяц юным віжам

**Адміністрацыя Ленінскага раёну Берасьця разам зь Берасьцейскім дзяржаўным унівэрсытэтам прапануе студэнтам 1—3 курсаў працу.**

Студэнтаў запрашаюць стаць супрацоўнікамі моладзевага атраду па ахове правапарадку. Гэты атрад створаны ў лістападзе 2006 году. Складаецца з студэнтаў БрДзУ і дзейнічае ад Адміністрацыі Ленінскага раёну горада.

Студэнтам прапануюць працу дружыньнікаў: за ўсім назіраць, а потым паведамляць у міліцыю. Прапануюць за такую працу 20$ за месяц.

**Павал Белавус, Берасьце**

## Высылаюць сьвятара

**У горадзе Рэчыца працаваў сьвятар зь вялікай літары — Гжэгаш Худэк.** Гэты чалавек быў сапраўдным душпастырам. Усё рабіў на карысьць Каталіцкага Касьцёлу і краіны. Дзякуючы яму і зьявілася для людзей Касьцёл замест піўбару. Аднак на сёньняшні дзень усё памянялася. Сьвятара высылаюць дамоў. А за што? За інтэрвію для польскай газэты, у якім ён казаў пра праўдзівае становішча ў Беларусі. Пра людзей, што жывуць у страху і заглушаюць яго з дапамогай гарэлкі і таннага віна або ў сэксе ці наркотыках. Сьвятар казаў у інтэрвію пра маральны стан людзей і пра тое, як людзей труцілі газам, калі яны спрабавалі адваяваць рэчыцкую сьвятыню. Вось праз гэта сьвятар і не атрымаў дазволу надалей працаваць у нашай краіне. Трэба паставіць пытаньне: хто наступны? Каго яшчэ палічаць непатрэбным?

**Мікалай, yahoo.com**

## За сякеры, землякі!

**Вырашылі, што выратаваньне Беларусі ад энэргетычнага голаду — у пераводзе эканомікі на дровы.** Гэтае простае і мудрае рашэньне імпэтна ажыцьцяўляецца. У Верхнядзьвінску на апэратыўна арганізаваных курсах з захаваньнем заробку і аплочаным праездам 33 чалавекі пасьпяхова завяршылі навучаньне па спэцыяльнасьці вальшчык лесу. Працы ўсім хопіць. Пачалі пляжыць векавечныя, дагледжаныя з панскіх часоў лясы ў прыдзьвінскіх масівах.

Замест карабельных бароў на лядах будуць вырошчваць ... лазу, бо вербавыя хутчэй растуць, і дроваў хопіць на доўгія гады. Кіроўцы лесавозаў, праўда, скардзяцца на дрэнныя дарогі — саляркі выгарае столькі, што сабе не застаецца. Вось каб яшчэ асфальт да дзялянак дацягнуць. А лепш — верталётамі бярвеньне вывозіць. А мо правесьці чыгункі, будуць бегаць электравозы, АЭС жа займеем...

Карацей, за сякеры, землякі!

**Антон Бубала, yandex.ru**

## Пакрыўдзілі творцаў

**Баранавіцкі гарвыканкам адмовіў у памяшканьні грамадзкай арганізацыі «Творчае згуртаваньне «Сьвятліца».** «Сьвятліца» зьвярнулася была ў гарвыканкам з просьбаю паспрыяць у атрыманьні памяшканьня для творчых сходаў. Зварот падпісалі 30 вядомых асобаў — мастакоў, літаратараў, фатографаў, бардаў. Яны спасылаліся на тое, што гарадзкі Дом культуры зьяўляецца агульнанароднаю ўласнасьцю, пабудаваны працаю нашых дзядоў і бацькоў і мусіць служыць усім творчым людзям.

У адказе з выканкаму спасылаліся на статут арганізацыі: «Сьвятліца» — самастойная арганізацыя…». І прыпісалі: «калі арганізацыя зьяўляецца самастойнай, то павінная самастойна вырашаць узьніклыя пытаньні, у тым ліку і тыя, што зьвязаныя з выбарам памяшканьня для творчых сходаў».

Цікава, а ці плацяць арэнду БРСМ?

**Руслан Равяка, Баранавічы**

## Зайздрошчу маладэчанцам!

**Ліст у «НН» Сяргея Космача з Маладэчна «Гонар за горад, дзе жыву» чытаў і радаваўся:** ёсьць жа мясьціны ў Беларусі, дзе людзі — а разам зь імі і ўлады — у свой час скасавалі савецка-камуністычныя назвы вуліцаў і плошчаў і назвалі іх у гонар знакамітых землякоў, нацыянальных герояў. Добры ўрок усім нашым малым і вялікім гарадам. Добры ўрок і Слуцку, які летась адзначыў свае 860-ыя ўгодкі.

У Слуцку пашанцавала толькі тром магістральным вуліцам дзякуючы высілкам тагачаснага старшыні гарвыканкаму. Вуліцы Ўрыцкага вярнулі старадаўную назву Капыльская, а Валадарскую пераназвалі ў вуліцу Максіма Багдановіча, бо на гэтай вуліцы ў канцы XVIII ст. знаходзілася фабрыка па вырабе славутых слуцкіх залатых паясоў. Вуліцы Карла Лібкнэхта, нямецкага камуніста, вярнулі дарэвалюцыйную назву — Віленская. На тым і спыніліся.

Бязь зьмены засталіся Акцябрская, Наябрская, Камсамольская, Савецкая, Леніна. Праўда, у 1980-я гады, з рэкамэндацыі пісьменьнікаў Случчыны (а яна на іх багатая), зьявіліся вуліцы Кузьмы Чорнага, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Антося Алешкі. Але ж яшчэ засталося столькі вартых імёнаў: Алесь Вечар, Юрка Гаўрук, Язэп Дыла, Сьцяпан Ліхадзіеўскі, Мікола Лобан, Альгерд Абуховіч, Алесь Кулакоўскі, Рыгор Крушына, Янка Золак, Уладзімер Клішэвіч. А хіба не заслужылі таго, каб іхнімі імёнамі назвалі вуліцы гораду, арганізатары Слуцкага збройнага чыну 1920-га году — Васіль Русак, Юрка Лістапад, якія загінулі ў ГУЛАГу?

Нязьменнымі застаюцца назвы-парадоксы Слуцку: вуліцы Кутузава, Суворава, Нахімава, Хмяльніцкага, Калініна, Кірава, Чкалава. Зьявіліся ў новых мікрараёнах вуліцы Пугачова, Ржаная (па-беларуску трэ было б «Жытнёвая»), Серпухаўская (горад Серпухаў стаў пабрацімам Слуцку). Так і адчуваецца ва ўсім гэтым паклон «старэйшаму брату» на ўсходзе.

У тапанімічным тупіку апынуліся і жыхары вуліцы 1 жніўня. Ніхто з жыхароў гэтае вуліцы ня ведае, што такое здарылася ў гэты дзень...

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

## Робім цуд разам!

**Як даўно ты пісаў лісты Дзеду Марозу? А калі апошні раз загадваў жаданьне на Новы год? Ці верыш ты ў цуд?**

ЯНЫ — пішуць. ЯНЫ — загадваюць.

І ЯНЫ — ВЕРАЦЬ!

У дзіцячым інтэрнаце ў мястэчку Станькава, што каля Менску, жыве 135 добрых і шчырых фантазэраў. Ванечка, напрыклад, марыць стаць прадаўцом марожанага, каб самому яго заўсёды есьці. Арцёмка часта бачыць у снах цягнік сіняга колеру. Магчыма, ён стане машыністам. А Лерачка хоча быць настаўніцай, яна вучыць лялек і мядзьведзіка чытаць…

І ўсе яны вераць, што менавіта пад Новы год адбудзецца цуд.

25 сьнежня мы ладзім сьвята для гэтых дзетак. Едзем у інтэрнат з падарункамі і добрымі памкненьнямі.

Ты можаш далучыцца: падараваць кніжку ці складанку, мячык ці каляровыя алоўкі, ці напісаць ліст. Патрэбна проста ўвага.

Зрабі СВОЙ падарунак дзіцяці

І перадай яго каардынатарам да 24 сьнежня.

Кантакты: Адар'я (029) 588-17-41, journalist1989@yandex.ru, Наста (029) 865-73-88, nastj1989@tut.by




**Гэта рэклама ў цягніку «Менск—Масква». Як той кажа, «no comments». Праўда, зьдзіўляе, што ва ўсёй Беларускай Чыгунцы не знайшлося аніводнага чалавека, які б узяў увагу на гэтыя памылкі. Таксама вельмі цікава тое, што расейцы ведаюць пра правілы ўжываньня «у» і «ў» і напісалі «па даступных коштах», а не «па даступным коштам», як пішуць некаторыя айчынныя «грамацеі», выхаваныя на «наркамаўцы».**

**Раман, tut.by**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Іванаўскас, які застаўся Іваноўскім

125-годзьдзе Тадэвуша Іваноўскага ўрачыста адзначылі сябры АПБ і мясцовыя жыхары на радзіме акадэміка.




**Маёнтак Іваноўскіх Лябёдка знаходзіцца ў выдатным стане і ўражвае прыгажосьцю, стылем і велічынёй.**

16 сьнежня 2007 году спаўняецца 125 год з дня нараджэньня нашага вялікага земляка, выбітнага заоляга і арнітоляга, акадэміка Тадэвуша Іваноўскага. Сябры грамадзкай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) вырашылі адзначыць гэты юбілей разам з калегамі зь Літоўскага арніталягічнага таварыства LOD (BirdLife у Літве) і жыхарамі в. Галавічполе (Шчучынскі раён на Гарадзеншчыне), недалёка ад якой знаходзіцца радавы маёнтак Іваноўскіх Лябёдка.

Дзякуючы падтрымцы Міністэрства адукацыі Беларусі і адміністрацыі Галавічпольскай сярэдняй школы-саду, мы зладзілі сапраўдную ўрачыстасьць. У нядзелю ў холе школы была адкрытая беларуска-літоўская фотавыстава «Сьвет птушак», якая складаецца са здымкаў Мікалая Гулінскага (беларускага фотамастака, сябра Савету Гарадзенскага абласнога аддзяленьня АПБ з Горадні) і літоўскага фотапаляўнічага Кэстуціса Чапэнаса (Kestutis Cepenas), прэзыдэнта LOD з Панявежыса). На адкрыцьці выставы перад прысутнымі школьнікамі, настаўнікамі, мясцовымі жыхарамі і сябрамі АПБ зь Менску і Горадні выступіў Мікалай Гулінскі, які заклікаў падрастаючае пакаленьне жыць паводле Тадэвуша Іваноўскага: «Любіць прыроду праз яе пазнаньне».

На жаль, Кэстуціс Чапэнас захварэў і ня змог прысутнічаць на ўрачыстасьці, аднак перадаў прысутным свае самыя найлепшыя пажаданьні, агучаныя Дзьмітрыем Вінчэўскім.

Пасьля гэтага адміністрацыя школы запрасіла ўсіх на дзьве навукова-папулярныя прэзэнтацыі, падрыхтаваныя сябрамі АПБ зь Менску і Горадні. Васіль Грычык (намесьнік дэкана біяфаку БДУ і сябра РК АПБ) распавёў пра беларускі пэрыяд жыцьця Тадэвуша Іваноўскага і значэньне ягоных працаў для сёньняшніх дасьледчыкаў птушак у Беларусі. Выявілася, што беларускія арнітолягі добра ведалі пра дзейнасьць свайго калегі зь Літвы акадэміка Тадаса Іванаўскаса. Але калі падчас працы над кандыдацкай дысэртацыяй Васіль Вітальевіч знайшоў у Заалягічным музэі Пецярбургу зборы птушак з пачатку XX ст. невядомага дасьледчыка зь Лідзкага павету Т.Іваноўскага, зусім ня проста было зразумець, што Іваноўскі і Іванаўскас насамрэч адная і тая ж асоба. У красавіку 1918 г. Іваноўскі, ці ўжо Іванаўскас, канчаткова перабіраецца ў незалежную Літоўскую Рэспубліку, але не парывае сувязяў зь Беларусьсю. Разам з выдаўцамі беларускага часопісу «Крывіч» (выходзіў у Коўне-Каўнасе ў 1923—1927 гг.) Вацлавам Ластоўскім і Клаўдзіем Дуж-Душэўскім у 1924 г. ён удзельнічае ў падрыхтоўцы артыкулу «*Намэнклятура беларускіх птушак» (*«Крывіч», № 1 (7), Каўнас, 1924, с. 48—59, 118). Фактычна, гэта была першая спроба навуковага абагульненьня беларускіх назваў для 199 відаў найбольш распаўсюджаных на тэрыторыі Беларусі прадстаўнікоў гэтай клясы жывёлаў. Цікава адзначыць, што многія з прапанаваных назваў цалкам, а некаторыя зь невялікімі зьменамі, былі выкарыстаныя ўжо сучаснымі беларускімі арнітолягамі для складаньня Навуковага сьпісу назваў птушак нашага кантынэнту ў 1999—2000 гг. падчас працы над перакладам і публікацыяй палявога вызначальніка «Птушкі Эўропы» (Варшава, «ПВН», 2000, 532 с.). Дарэчы, тэкстамі з гэтага вызначальніка можна карыстацца на сайце АПБ).



Дзьмітры Вінчэўскі (Старшыня Савету Гарадзенскага абласнога аддзяленьня АПБ і выкладчык біяфаку Гарадзенскага дзяржунівэрсытэту імя Я.Купалы) распавёў пра літоўскі пэрыяд жыцьця і дзейнасьці Тадаса Іванаўскаса. Напрыканцы сустрэчы Дзьмітры Вінчэўскі ад імя АПБ перадаў у бібліятэку школы палявы вызначальнік «Птушкі Эўропы».

Пасьля сябры АПБ былі запрошаныя ў школьны краязнаўчы музэй, дзе пазнаёміліся зь невялікай, але густоўна падабранай і аформленай экспазыцыяй. Больш падрабязна пра сувязі Іваноўскіх з гэтымі мясьцінамі і іх жыцьцёвыя шляхі расказала настаўніца малодшых клясаў і экскурсавод.

Пасьля сустрэчы ў школе сябры АПБ скіраваліся на непрацяглую экскурсію ў маёнтак Іваноўскіх «Лябёдка», які знаходзіцца літаральна за некалькі сотняў мэтраў ад в. Галавічполе. Будынкі і цяпер знаходзяцца ў выдатным стане і ўражваюць прыгажосьцю, стылем і велічынёй.

Пасьля закрыцьця фотавыставы, калі скончацца школьныя зімовыя канікулы, усе здымкі выставы будуць падараваныя Галавічпольскай школе-саду.

**Дзьмітры Вінчэўскі, АПБ, Горадня**

# Віржынія Шыманец: «Кожная ўлада

Гутарка зь **Віржыніяй Шыманец**, сузаснавальніцай асацыяцыі Perspectives Biélorussiennes, доктаркай унівэрсытэту Парыж III, аўтаркай дысэртацыі, прысьвечанай беларускаму тэатру першых дзесяцігодзьдзяў XX стагодзьдзя. Разам з Ларысай Гіймэ яна зрабіла пераклад выбраных разьдзелаў раману Артура Клінава «Горад СОНца» на французскую мову.

**«НН»: Якія ў Вас уражаньні ад чытаньняў Артура Клінава ў Парыжы?**

**Віржынія Шыманец:** Для нас гэта вельмі важна, таму што вельмі рэдка ёсьць магчымасьць паслухаць беларускую мову ў Парыжы. Цудоўна, што цяпер ёсьць такое месца, як «Дом Эўропы і Ўсходу», якое можа гуртаваць у супольных праектах усе арганізацыі, якія працуюць у Парыжы для Беларусі. Гэта самае галоўнае. Я пачала займацца беларускімі справамі ўжо больш за дзесяць год таму і ўпершыню адчуваю, што ёсьць арганізацыі, асацыяцыі, якія ня хочуць быць канкурэнтамі, а сапраўды хочуць нешта ўяўляць разам.

**«НН»: У чым прычына такіх зьменаў?**

**ВШ:** Я думаю, быў вельмі важны момант у самім часе і пасьля прэзыдэнцкіх выбараў. Нашыя людзі пабачылі на тэлеэкранах, які гвалт зьдзяйсьняўся ў Беларусі. Яны пабачылі людзей, якія змагаліся кветкамі, а ня зброяй, супраць цэлай сыстэмы. Многія нашыя сябры былі арыштаваныя. Мы былі ў шоку. І тады нешта здарылася. Мы ўпершыню пачалі размаўляць, раіцца пра тое, што мы можам рабіць разам.

**«НН»: То бок, сакавіцкія падзеі 2006 г. значна паўплывалі на ўспрыманьне Беларусі ў Францыі?**

**ВШ:** Ня толькі ў Францыі, але паўсюль у Эўропе. Два дні таму нейкі чалавек, які жыве ў Швайцарыі, хацеў зьвязацца з намі. Людзі зь Нямеччыны, з Бэльгіі шукаюць кантакту. Паглядзім, які плён гэта дасьць у будучыні. У 1996 г., калі мы пачыналі займацца беларускімі справамі ў Парыжы, нас было



АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

толькі тры чалавекі. Мы паглядзелі адно аднаму ў вочы і зразумелі: нам гэта цікава. Пачынаем! А цяпер ёсьць іншыя асацыяцыі, якія нарадзіліся, напрыклад — Belprojet, ёсьць нават памяшканьне — «Дом Эўропы і Ўсходу» ў Парыжы, дзе мы можам ладзіць супольныя імпрэзы. Нашыя арганізацыі спрабуюць стаць узаемадапаўняльнымі. Канкурэнцыя — гэта ня тое, чаго мы жадаем. Трэба працаваць разам, каб кожны мог разьвівацца. Але, разам з тым, мы ня будзем ствараць нейкую фэдэрацыю з адным кіраўніком.

**«НН»: Як узьнікла вашая асацыяцыя Perspectives Biélorussiennes?**

**ВШ:** Нашая асацыяцыя была створаная больш чым дзесяць год таму. Нас было тры чалавекі, якія жадалі напісаць доктарскія дысэртацыі пра Беларусь. Мы былі ў дзіўнай сытуацыі. Калі мы шукалі інфармацыю, сустракаліся з польскімі людзьмі, яны нам казалі: Беларусь не існуе. Калі мы хацелі шукаць інфармацыю у расейскіх людзей, яны нам казалі: Беларусь не існуе. Мы былі ў вакууме, пакуль ня зьезьдзілі ў Беларусь.

Беларускія асацыяцыі былі ў Францыі і раней. Але гэтыя людзі размаўлялі па-беларуску, пісалі па-беларуску, адрасуючы сваю працу толькі беларускамоўным людзям. Гэта было як маленькае гета. Яны казалі: шкада, што нас не разумеюць. Але ніякі француз ня ўмее размаўляць ці чытаць па-беларуску. Для таго, каб зьмяніць погляды французаў на Беларусь, трэба таксама пісаць і па-французску. А стэрэатыпы ў Францыі былі такія, што Вы проста сабе не ўяўляеце. Тое, што Беларусь лічылі часткай Расеі, гэта яшчэ, так бы мовіць, ня самае страшнае. Заўсёды існавала ідэя, што гэтая краіна ўвогуле не існуе. Ёсьць Польшча, Расея, а тут — невядома што. Мы чыталі артыкулы, аўтары якіх з патасам сьцьвярджалі, што на гэтай тэрыторыі заўсёды ідзе дождж, што гэта краіна, дзе няма сонца, дзе людзі сумныя, дзе няма нічога вартага ды цікавага. Але мы адчувалі, што гэта няпраўда.

**«НН»: Чым цяпер займаецца Perspectives Biélorussiennes?**

**ВШ:** Раз на тры месяцы выдаем бюлетэнь па-французску. Спрабуем адаптавацца да новай сытуацыі. Нараджаюцца іншыя асацыяцыі, якія таксама займаюцца беларускімі справамі. Яны жадаюць працаваць па-сучаснаму, з інтэрнэтам, напрыклад, зьмяшчаць вельмі кароткія навіны. Мы ня будзем працаваць так. У нашай асацыяцыі ёсьць спэцыялісты, якія дасьледуюць палітыку ці мастацтва. Мы таксама пашыраем дзейнасьць у інтэрнэце, але ўжо прысьпеў час альбо стварыць рэальны часопіс, альбо дасьледчыя групы, якія змогуць праводзіць дэтальны аналіз такі зьяваў, як, напрыклад, дзяржаўная ідэалёгія, аўтарытарызм, аналізаваць культурныя фэномэны і г. д. Таму мы шукаем магчымасьці стварыць усё гэта. Надышоў момант, калі расчыняюцца новыя дзьверы.

**«НН»: Адкуль Вы так добра ведаеце беларускую мову?**

**ВШ:** Мае дзяды былі беларусамі. З Засульля, гэта маленькая вёска недалёка ад Менску. Мой бацька нарадзіўся ў Беларусі. Я заўсёды жыла зь людзьмі, якія жыва цікавіліся, што адбываецца на радзіме. Мае дзяды размаўлялі па-беларуску, я слухала гэтую мову ўсё дзяцінства. Я не размаўляла зь імі па-беларуску, а шкада, бо я шмат згубіла. Толькі тады, калі ўпала «жалезная заслона», я здолела прыехаць у Беларусь і спрабавала вывучыць мову. Не магу сказаць, што я вельмі добра размаўляю. Толькі ў Беларусі, зь людзьмі, якія размаўляюць па-беларуску, я магу практыкавацца, адчуваць, што я ня думаю па-французску. Але ўвогуле я думаю па-францус-

# хоча мецьсваю беларускую мову»

ку, нават цяпер. Я яшчэ шукаю мой слоўнік, я яшчэ не адчуваю сябе вельмі свабоднай у беларускай мове.

**«НН»: Ці складана гэта — размаўляць па-беларуску ў Беларусі?**

**ВШ:** Калі ты працуеш у архіве і запытваесься нешта па-беларуску, то чалавек табе кажа: «Хадзем пакурыць у туалет». І толькі там ён пачынае гаварыць па-беларуску, толькі ў туалетах, у падвале, дзе ніхто ня можа яго падслухаць, бо ён баіцца. Я ня думала, што людзі могуць так баяцца. Але ёсьць і іншы аспэкт: трэба шмат працаваць для таго, каб людзі ў Беларусі зрабіліся сапраўды талерантнымі. Калі я прыяжджала ў Беларусь, то перажыла абсурдныя сытуацыі, як, бадай, кожны, хто жадае вывучыць мову. Вы нічога ня ведаеце, вы ніколі не размаўлялі па-беларуску, але вы спрабуеце. Вы думаеце: акей, сёньня я нешта скажу па-беларуску. Вы выходзіце на вуліцу. Вы сустракаецеся з чалавекам. «Добры дзень!» — «Добры дзень!» Вы ведаеце, што вы робіце памылкі, вы не пачуваецеся свабодна, але ўсё-такі вы спрабуеце. Суразмоўца таксама намагаецца вас зразумець. На разьвітаньне вы кажаце: «Да пабачэньня, сазвонімся». І тады ён падскоквае: «Не, «пазваніць» — гэта па-расейску! Трэба казаць «патэлефанаваць». Другі чалавек, калі вы разьвітваецеся зь ім словамі «стэлефануемся», крычыць, што «патэлефанаваць» — гэта польская мова, і трэба казаць «пазваніць». Як вывучыць мову ў такой сытуацыі? Гэта антыпэдагагічныя манеры. Таму няма нічога дзіўнага, што людзі так доўга ня могуць навучыцца размаўляць па-беларуску. У Беларусі людзі ня маюць права на памылку. А гэта самае галоўнае права чалавека — мець права зьмяніцца.

**«НН»: Што Вы думаеце наконт магчымага ўвядзеньня новага афіцыйнага правапісу ў Беларусі?**

**ВШ:** Кожная ўлада жадае мець сваю беларускую мову, але вельмі важна разумець, як яна выкарыстоўвае рэформы. Ці людзі ў Беларусі, якія маюць уладу, выкарыстоўваюць мову дзеля таго, каб людзі маглі нармальна, свабодна камунікаваць, альбо яны выкарыстоўваюць тэму мовы дзеля таго, каб ламаць камунікацыі паміж людзьмі, захоўваючы такім чынам той самы аўтарытарны рэжым. Рабіць рэформы — гэта знак улады. Але ў выпадку з мовай вы чапаеце нешта вельмі інтымнае. Тым больш, што моўную рэформу немагчыма правесьці адразу, гэта заўжды плян на будучыню. За моўнымі рэформамі заўсёды хаваецца грамадзкі праект. Праект Тарашкевіча — гэта адно, савецкая беларуская мова — гэта зусім іншае бачаньне грамадзтва. Новая афіцыйная беларуская мова будзе таксама мець свой праект, і мне вельмі цікава пабачыць, які менавіта.

Часта моўныя пытаньні выкарыстоўваюць для таго, каб маніпуляваць людзьмі. Цудоўны прыклад — рэфэрэндум 1995 г., калі паставілі пытаньне мовы толькі для таго, каб адцягнуць увагу людзей ад пытаньня пра зьмены ў канстытуцыі. Вельмі цікава назіраць, як палітыкі выкарыстоўваюць моўнае пытаньне. Мова — гэта важна, культура — таксама важна. Але немагчыма ўсе праблемы вырашыць праз гэта. Трэба таксама ясна і канкрэтна займацца таксама і іншымі праблемамі. Здаецца, я не павінна так казаць, я павінна бараніць мой лягер — тэатральны, культурны. Але пакуль у Беларусі няма палітычных, эканамічных сродкаў, каб рабіць культуру. Якая культура можа быць у аўтарытарным рэжыме, якая мова? Я думаю, што нельга вырашаць праблему наадварот. Я яшчэ ня маю ўсіх ключоў, каб аналізаваць усё гэта, але я працую і спадзяюся, што адшукаю іх.

**«НН»: Як даўно Вы былі ў Беларусі апошні раз?**

**ВШ:** Ажно тры гады таму. Я вельмі сумую па Беларусі. Цяпер я займаюся сваім маленькім сынам, дый сродкі для падарожжа адшукаць даволі складана. Таму я спрабую рабіць карысныя рэчы тут, у Францыі, напрыклад, займаюся перакладамі. Мне здаецца, было вельмі важна перакласьці «Тутэйшых» Янкі Купалы на француcкую мову. Разам з Ларысай Гіймэ мы два гады працавалі над гэтым тэкстам.

**«НН»: Ці складана было перакладаць «Тутэйшых»? Ці магчыма зрабіць гэты твор зразумелым для француза?**

**ВШ:** Я заўсёды была ўпэўненая, што мы можам знайсьці шлях данесьці «Тутэйшых» да францускага чытача. Аднак гэтая п’еса сапраўды вельмі складаная. Беларуская мова 1920-х гадоў, царкоўнаславянская мова, нямецкая мова, ідыш, польская мова, трасянка... Людзі, якія перакладаюць гэтую п’есу, павінныя імі валодаць. А мы маладыя, нам беларускую мову 1920-х гадоў вельмі цяжка зразумець. Мы езьдзілі ў Беларусь, каб знайсьці добрыя слоўнікі. Стварылася нефармальная каманда, якая дапамагала, напрыклад, разабрацца, што гэта значыць — «гэрцум-сролікі». Мы знайшлі чатыры спосабы перакласьці гэтае слова, але не маглі выбраць слушны. Давялося нават праз інтэрнэт шукаць у Ізраілі дасьледчыкаў, якія яшчэ размаўляюць на ідыш, і могуць супаставіць яго зь нямецкай мовай. У Парыжы мы шукалі палякаў, якія тлумачылі нам польскія словы. Гэта была фантастычная праца. Я думаю, што пераклад надта добры, мы ім вельмі задаволеныя. Першы раз людзі таксама гуртаваліся для таго, каб тэкст мог быць апублікаваны па-француску. Гэта шчасьце!

**«НН»: Але ж у Вас атрымаўся ня проста пераклад, а яшчэ і своеасаблівы даведнік для чалавека, які мала знаёмы з часам, у які адбываецца дзеяньне ў «Тутэйшых»...**

**ВШ:** Так, мы зрабілі адмысловую табліцу, у якой тлумачыцца, як трэба правільна вымаўляць беларускія гукі. Інакш французы прачытаюць «Mensk» як «Мэнск». Таксама ў кніжцы пададзена гістарычная храналёгія для таго, каб чытачы маглі ўяўляць, у якой сытуацыі адбываюцца дзеі п’есы. Ёсьць там і разьдзел пра тое, хто быў Купала, і дзе тлумачыцца, чаму мы палічылі важным перакласьці гэты тэкст. Нават у расейскамоўных асяродзьдзях Францыі былі вельмі ўдзячныя за гэтую кніжку. Людзі казалі: «Нарэшце»! Я спадзяюся, што будуць іншыя клясычныя тэксты па-француску.

**«НН»: Што ў Вас у плянах, задумах, марах?**

**ВШ:** Я хачу скончыць маю кнігу пра мову. Гэта самае галоўнае для мяне. Гэта вельмі вялікі кавалак працы, бо я хачу разабрацца, як моўнае пытаньне ўплывала і выкарыстоўвалася ў будаўніцтве ўсходнеславянскіх нацыяў. Трэба апрацаваць агромністы аб’ём дакумэнтаў па-расейску, па-беларуску, па-польску, па-француску, па-ангельску, па-ўкраінску. Я думаю, што я ніколі так не працавала, каб нешта зразумець. А потым, як дапішу, для мяне пачнецца новае жыцьцё… Буду рабіць нешта новае, спакайнейшае, лягчэйшае.

**Гутарыў Алесь Кудрыцкі**

# Каралеўская птушка Альбаніі, або Карона Скандэрбэга

Інтэграцыя беларуска-расейскага ўзору мела свой прэцэдэнт між Італіяй і Альбаніяй у 1920—30-я. Піша **Вацлаў Шаблінскі**.

*Вінцэсю Мудрову прысьвячаю*

28 кастрычніка спаўняецца 75 гадоў з абвяшчэньня незалежнасьці Альбаніі. Гэтая краіна асацыюецца ў нас зь беднасьцю і мафіяй. Сёй-той успомніць камуністычнага дыктатара Энвэра Ходжу і яго дзоты. Практычна невядомая ў нас асоба альбанскага караля Ахмэта Зогу. Між тым гісторыя альбанскай манархіі вельмі павучальная для беларусаў.

За пяць стагодзьдзяў турэцкага панаваньня альбанская арыстакратыя прыняла іслам і стала не апошняй часткай асманскай эліты. Хрысьціянская меншасьць таксама служыла султану. Вядомая гісторыя аднаго альбанца, які трапіў у палон да расейцаў і захацеў прысутнічаць на праваслаўнай імшы. На пытаньне, як можа ён, хрысьціянін, «*служыць басурманам*», гэты нашчадак іліраў адказаў*: «Рэлігія — рэлігіяй, а прафэсія — прафэсіяй»*. Такая лаяльнасьць не ў апошнюю чаргу тлумачылася страхам, што краіну, пазбаўленую апекі Стамбулу, могуць падзяліць суседзі: сэрбы, чарнагорцы, грэкі. І толькі калі ў выніку Балканскіх войнаў імпэрыя пачала распадацца, альбанскія пашы і бэі сабраліся 28 кастрычніка 1912 году ў горадзе Влёра і абвясьцілі незалежнасьць «краіны горных арлоў», так называюць сябе альбанцы.


Лёка Зогу.

Першы альбанскі ўрад, на чале з «бацькам незалежнасьці» Ісмаілам Кемалем, бэем гораду Влёра, ня быў прызнаны Эўропай. У сваю чаргу, нямецкі князь Від, прызначаны спэцыяльнай міжнароднай камісіяй манархам Альбаніі, не прыжыўся ў мусульманскай краіне.

Першая ўсясьветная вайна ўвогуле заблытала альбанскае пытаньне. На тэрыторыі краіны дзейнічалі аўстрыйскія, францускія, сэрбскія, грэцкія, італійскія войскі. Межы мяняліся ледзь ня кожны дзень. Альбанскія лідэры кіраваліся прынцыпам: «Мой гонар даражэйшы мне за гонар Альбаніі».

Толькі ў 1922 годзе краіну пакінулі апошнія іншаземныя войскі і прайшлі першыя ў яе гісторыі парлямэнцкія выбары. Перамагла Дэмакратычная партыя, якая абяцала народу аграрную рэформу і ўсталяваньне дэмакратыі.

Сярод альбанскіх «дэмакратаў» вылучаліся Фан Нолі — аднагодак Коласа і Купалы, вытанчаны інтэлектуал, перакладчык Ніцшэ, Шэксьпіра, Амара Хаяма. Нолі спалучаў сацыялістычныя сымпатыі з санам мітрапаліта Праваслаўнай царквы.

Прыкметнай асобай быў таксама Ахмэт Зогу. Ён нарадзіўся ў 1895 годзе і паходзіў зь сям'і пашы. Род ягоны быў ня вельмі багатым, што не перашкодзіла Ахмэту скончыць вайсковую вучэльню ў Вене і атрымаць затым званьне палкоўніка аўстрыйскага войска. Зогу і Нолі вылучаліся замежнай адукацыяй і займелі бясспрэчныя заслугі падчас барацьбы за незалежнасьць. Аднак Зогу быў мусульманінам і, у адрозьненьне ад народжанага ў Грэцыі


Ахмэт Зогу.

Нолі, карэнным альбанцам. Таму менавіта яго вылучалі ў прэм'еры. Паміж былымі паплечнікамі пачалася сварка. У чэрвені 1924 Зогу зьбег, а прэм'ерам стаў Нолі. Але «чырвонаму біскапу» нядоўга давялося быць пры ўладзе. У сьнежні таго ж году яго супернік вярнуўся і бяз бою заняў Тырану. Нолі вымушаны быў эміграваць у ЗША, дзе і памёр.

Зогу было чым ганарыцца ў свае трыццаць год. Малады альбанец быў наймаладзейшым сярод прэзы-

Альбанскі лідэр Зогу ня быў проста італійскай марыянэткай. Ягоныя стасункі зь «вялікім саюзьнікам», так афіцыйна называлі Італію, мелі вымагальніцкі характар. Наўзамен працягу сяброўства з Рымам кароль патрабаваў фінансавую падтрымку, пагражаючы ў адваротным выпадку знайсьці іншага спонсара.

дэнтаў сьвету. Але яго чакаў яшчэ больш незвычайны ўзьлёт. У 1928 годзе прэзыдэнт Альбанскай рэспублікі робіцца «*Яго высокай вялікасьцю Зогу Першым, каралём усіх альбанцаў*». Для замацаваньня ўлады новага караля яго абвясьцілі нашчадкам нацыянальнага героя Альбаніі Георгія Кастрыёці Скандэрбэга. Гэтая постаць была некалі вядомая ў Беларусі. У часы Вялікага Княства хадзіла «Аповесьць пра Скандэрбэга, князя альбанскага». Яе сюжэт выкарыстаў Дунін-Марцінкевіч для адной з сваіх паэмаў. На сваяцтва з альбанскім князем прэтэндаваў ураджэнец Меншчыны Фадзей Булгарын.

Ахмэт Зогу стаў другім, пасьля Напалеона III, прэзыдэнтам, які стаў манархам. Гэтае ператварэньне было задуманае і распрацаванае ў Рыме. Такім чынам, Мусаліні разьлічваў прывязаць да сябе альбанскага лідэра, які яшчэ нядаўна лічыўся прасэрбскім і да ўлады вярнуўся з дапамогай Белграду. Разьлік аказаўся правільным. У тым жа 1928 г. італійскі дыплямат пісаў: «Палітычнае становішча (Альбаніі. — *В.Ш.*) добрае. Ня бачна ... дзейнасьці іншаземца, якая можа канкураваць з намі». І гэта была праўда, італьянцы кантралявалі альбанскі нацыянальны банк, адукацыю, прамысловасьць і войска. Наўзамен яны абяцалі Зогу падтрымку, калі ўзьнікне пагроза ягонаму рэжыму.

Зогу ня быў проста італьянскай марыянэткай. Ягоныя стасункі зь «вялікім саюзьнікам», так афіцыйна называлі Італію, мелі, па сутнасьці, вымагальніцкі характар. Наўзамен за працяг сяброўства з Рымам кароль патрабаваў вялізныя сумы, пагражаючы ў адваротным выпадку знайсьці іншага спонсара.




Італійцы цярпелі: не было гарантыі, што іншы альбанскі «сябар» будзе таньнейшым. З другога боку, магчымасьці Зогу былі абмежаваныя, ніхто ў Эўропе не хацеў мець зь ім справы.

Трэба сказаць, што італійскія інвэстыцыі мала што давалі краіне. Большая частка бюджэту ішла на ўтрыманьне двара і значна менш— на народную асьвету і ахову здароўя, разам узятыя. Хоць кароль неаднаразова казаў пра жаданьне бачыць сваю краіну эўрапейскай, у альбанскім каралеўстве так і не зьявіліся тэатар, унівэрсытэт, чыгунка. На месцах панаваў «закон гор», пра палітычныя свабоды не было і чуваць. Народ выказваў сваё стаўленьне да самаабвешчанага каралеўства ў анэкдотах: *«Як жывеш суседзе? — Цудоўна, калі зьяжджаў, нават хату зачыняць не стаў. — І злодзеяў не баісься? — Ды якія ў нас злодзеі? Яны ж усе ў Тыране пазьбіраліся».*

Так цягнулася, пакуль Яго Высокая Вялікасьць не атрымаў 5 красавіка 1939 году ад свайго вялікага саюзьніка прапановы пра далейшую інтэграцыю двух каралеўстваў. Ад альбанцаў патрабавалася заключыць з Італіяй мытны саюз, дазволіць вайсковыя базы на сваёй тэрыторыі. Кароль абвясьціў, што будзе змагацца і... зьбег.

Краіна аказалася безабароннай, хаця, са словаў італійскага генэрала, хапіла б і «*добра арганізаванай пажарнай каманды, каб скінуць у мора*» «макароньнікаў».

Сьвет прарэагаваў на гэтыя падзеі прыблізна так, як героі Вячаслава Адамчыка: «*Далёка ад нас тая Альбанія».*

Італьянцаў неўзабаве зьмянілі немцы, затым камуністы. Ім на зьмену прыйшлі дэмакраты. Лідэр альбанскіх дэмакратаў Салі Бэрыша атрымаў прозьвішча «апошні бальшавік Эўропы» і ўвайшоў у адзін з Лукашэнкам сьпіс «ворагаў свабоднага друку». Пры ім у Альбаніі зьявіліся фінансавыя піраміды, адрадзілася кроўная помста і краіна аказалася пад пагрозай распаду. У народзе з адчаем пачалі гаварыць: «У *нас няма дэмакратаў. Ёсьць камуністы, былыя і сёньняшнія*». І тут на



**Салі Бэрыша ўвайшоў у адзін з Лукашэнкам сьпіс «ворагаў свабоднага друку».**

альбанскім небасхіле зноў зьявілася каралеўская «птушка», так перакладаецца прозьвішча «Зогу», ці, дакладней, зорка — «Лёка». Лёка Першы нарадзіўся ў той самы дзень, калі ягоны бацька атрымаў італійскі ўльтыматум. Альбанія яшчэ пасьпела адзначыць нараджэньне прынцаспадкаемца.

Пасьля вайны каралеўская сям’я жыла ў Парыжы, існуючы на сродкі маці Лёкі, Жэральдзіны Апоны, вугорскай графіні, якая пісала дэтэктыўныя раманы і ўспаміны. Пасьля сьмерці Зогу-старэйшага Лёка перабраўся ў Паўднёва-Афрыканскую Рэспубліку. Як і бацька, ён атрымаў званьне палкоўніка. Гандаль зброяй дазволіў злажыць немалы капітал. Паклапаціўся Лёка і аб працягу дынастыі.

Здавалася, у Лёкі немалыя шанцы вярнуць трон. Пасьля эпохі «альбанскага Сталіна» Энвэры Ходжы, каралеўскія часы, калі да палітвязьняў зьвярталіся «панове», а тыранская багема абмяркоўвала навінкі Вены, Рыму, Парыжу, выглядалі «залатой парой». Да таго ж, пантэнцыйны манарх шчодра адорваў будучых падданых. Але зьяўленьне новага «караля ўсіх альбанцаў» не ўваходзіла ні ў пляны асноўных палітычных партыяў, ні, тым больш, у пляны суседзяў Альбаніі. На рэфэрэндуме 1997 г. Лёка пацярпеў паразу. Ён, аднак, не здаецца. «Яго Ввысокая Вялікасьць» дамогся права жыць на радзіме і цяпер ставіць пытаньне пра новы рэфэрэндум.

P.S. У нашым грамадзтве распаўсюджанае меркаваньне, што аўтарытарная ўлада, нібыта, спрыяе ўмацаваньню сувэрэнітэту і эканамічнаму разьвіцьцю краіны. Альбанская гісторыя сьведчыць пра адваротнае.

# Куцьця

Ад беларусаў яе пазычылі і літоўцы, і ўсходнія палякі. Піша **Алесь Белы**.



Фармальна хрысьціянства ня мае ніякай рытуальнай ежы, апроч містычнага Цела Хрыстовага. Магія ў чыстым выглядзе асуджаецца монатэістычнай рэлігіяй. Аднак здаўна на праявы рознага кшталту «народнага хрысьціянства» і Каталіцкі Касьцёл, і Праваслаўная Царква глядзяць калі не прыхільна, дык паблажліва, дазваляючы і нават прапануючы карыстацца такой сымболікай абрадаў, якая дае паспалітаму люду, асабліва дзецям, адчуць радаснае суперажываньне з героямі знакавых падзей сьвятой гісторыі, зразумець іх значэньне на ўзроўні, адпаведным узроўню адукацыі і звычцы да разважаньняў кожнага асобнага чалавека. Таму і засталіся ва ўжытку рытуальныя стравы яшчэ з паганскіх часоў, напоўненыя новым хрысьціянскім сэнсам, хаця рыгарыстычная пратэстанцкая этыка адназначна асуджае іх як ідалапаклонства. Сапраўды, пра велікоднае яйка і калядную куцьцю няма згадак у Эвангельлі, але хіба дзясяткі пакаленьняў людзей, звычайных і славутых, што іх гатавалі і елі, спрэс трапілі ў пекла? У XX ст. прыхільнікам прагрэсу нарэшце ўдалося-такі адвучыць люд паспаліты ад гэтых звычаяў (у Беларусі больш пасьпяхова, чым дзесь яшчэ); праўда, вызвалены ад састарэлых практык час быў заняты не паглыбленым вывучэньнем Бібліі, а будаўніцтвам тысячагадовага царства непасрэдна на Зямлі. Пра вынікі шаноўны чытач хай мяркуе самастойна.

Куцьця — гэта каша з крупаў, у большасьці выпадкаў ячных (панцаку), якую раней гатавалі для жалобнага стала па нябожчыку — на індывідуальныя памінкі, а таксама на Дзяды, Радуніцу і іншыя памінальныя дні, і спажывалі астуджанай з сытой (вадой зь мёдам) або алеем. Памінальная куцьця, якую варылі з цэлых зярнят, была сымбалем вечнасьці жыцьця. Але найбольш вядомай была менавіта куцьця — абрадавая страва на Каляды; каша з цэлых або тоўчаных ячных круп, прыпраўленая мёдам і макам (макавым «малаком»). У іншых выпадках, звычайна ў больш заможных сем'ях, куцьцю варылі з пшаніцы або нават з рысу, дадавалі арэхі, разынкі і іншыя слодычы.

У народнай этымалёгіі куцьця выводзілася ад «кута», бо, маўляў, стаяла на пачэсным месьце ў куце, як гэта апісана ў «Новай зямлі»:

Куцьці гаршчок ужо ў калена  
Стаяў на лаве, чакаў сена,  
І вось цяпер гаршчок з куцьцёю,  
Як цар даўнейшаю парою,  
Ў пачэсны кут, на свой прастол,  
Стаўляўся з гонарам за стол  
На гэта сена пад багамі,  
Ўладар над хлебам і блінамі,  
Бо ён у гэты дзень — пэрсона!  
Яго вянчаў абрус–карона.

Сялянскаму сьветапогляду сувязь куцьці з кутом мусіла здавацца неабвержнай. Але насамрэч гэтае слова грэцкага паходжаньня. Слова «кукія», ад дзеяслова «кікан», які азначае «загушчаць нешта, бесьперапынна памешваючы», азначае страву, вядомую грэкам ці не з часоў Гамэра, нешта сярэдняе паміж кашай і ўзварам. Магчыма, падобная страва, славянская назва якой не захавалася, існавала ў старажытных славян і незалежна ад


## Калядны нумар «НН»

Калядны нумар «НН» з палітычнымі, эканамічнымі, культурнымі вынікамі году выйдзе 27 сьнежня. Таксама ў Калядным нумары — вызначэньне Чалавека году, Падзеі году, Кнігі году, і традыцыйны цыкль «Сем апавяданьняў на сем калядных вечароў».

грэкаў. Лічыцца, што супольнае спажываньне стравы са збожжа, мёду і маку сымбалізавала дабрабыт, добрую волю і прымірэньне, нешта накшталт «люлькі міру» ў індзейцаў. Аднак назва і кананічны склад куцьці, разам з сэмантычным атаясамленьнем зь вячэрай напярэдадні Божага Нараджэньня, несумненна, прыйшла да ўсходніх славян разам з хрышчэньнем Русі.

Уплыў бізантыйскіх традыцыяў на нашу кухню — тэма для асобнай гутаркі, бо зь берагоў Басфору да нас прыйшлі і агуркі, і грэчка, і буракі, і чарэшня, і шмат чаго іншага. За дзевяцьсот гадоў куцьця настолькі трывала ўвайшла ў народны побыт беларусаў і ўкраінцаў, што пераадолела і міжканфэсійныя бар'еры: для каталікоў грэка-праваслаўная куцьця стала абавязковым элементам вігіліі Божага Нараджэньня і іншых сьвятаў каляднага цыклю. Ад беларусаўлітвінаў яе пазычылі літоўцы (суцэльна) і палякі (часткова), хаця агульнапольскай куцьця так і ня стала, успрымаючыся як тыпова «крэсовая» зьява.

Што ж, куцьця зь яе міжканфэсійным сымбалічным значэньнем, з выразным сьведчаньнем колішняга нашага культурнага ўплыву на суседнія народы, магла б быць вельмі пачэсным агульнабеларускім звычаем, як заклікаў Купала ў сваёй забароненай Саветамі паэме «На Куцьцю»...

У літоўскай мове вігілійная вячэра, ды і сам дзень 24 сьнежня, так і называецца **Kūčios**, як было калісь і ў Беларусі, адкуль гэтае грэцкае слова прыйшло да літоўцаў — Куцьця: страва, вячэра, сьвята, дзень календара. Але сёньня ўся гэтая сэмантыка амаль зусім страчаная беларусамі. У палякаў пярэдадзень Божага Нараджэньня называюць Вігіліяй, ад лацінскага «vigiliare» — «чуйнаваць, ня спаць, пільнаваць», у расейцаў — «Сочельник», таму што саму куцьцю пераважна называюць сочывам, хаця вядомае і слова *кутья*.

Куцьця на вігілію Божага Нараджэньня, 24 сьнежня, у апошні дзень *Адвэнту*, у які належыць сьцісла пост і толькі адзін прыём ежы дасыта, называлася поснай, галоднай або Вялікай куцьцёй. Трэ было галодным цэлы дзень чакаць гэтай вячэры, каб больш выразна адчуць радасьць ад нараджэньня Збаўцы. У адрозьненьне ад велікодных сьвятаў, якія сьвяткаваліся максымальна публічна, Вігілія мела падкрэсьлена сямейны, закрыты характар. Аднак лічылася, што да вігілійнага стала абавязкова трэба запрасіць любога выпадковага госьця, каб не паўтарыць граху тых, хто не пусьціў пераначаваць Сьвятую Сям'ю перад нараджэньнем Хрыста, прымусіўшы Марыю нарадзіць яго ў стайні. На вячэру зьбіраліся пасьля зьяўленьня на небе першых зорак, пад выбеленым абрусам сьцялілі сена або салому як напамін пра нараджэньне Хрыста ў стайні.

Перад пачаткам вячэры гаспадар дому мусіць падзяліцца зь сям'ёй асьвечанымі ў касьцёле аблаткамі. Бацька, або хтосьці самы старэйшы ў сям'і пры сьвятле сьвечкі, што сымбалізуе бэтлеемскую зорку, чытае ўрывак з Эвангельля паводле сьвятога Лукі, у якім апісваецца нараджэньне Езуса ў Бэтлееме. Затым, пасьля супольнай малітвы, усе бяруць у рукі аблаткі і, падыходзячы адзін да аднаго, ломяць іх між сабой і абменьваюцца сьвяточнымі пажаданьнямі. Па выцягнутых з-пад абруса сьцяблінках варажылі, які будзе наступны год; пасьля вячэры сена, як і рэшткі вячэры, аддавалі жывёле. На Вігілію плялі саламяных «павукоў», якіх вешалі ў доме ці перад уваходам, упрыгожвалі дом або падворак хваінкай або ялінкай (з XVIII ст.), дарылі сямейнікам і слугам падарункі («каляду»).

Праваслаўныя звычаі былі досыць падобныя. Коласава апісаньне Куцьці з «Новай зямлі» выглядае яскрава каталіцкім, але ж не забудземся, што сям'я Міцкевічаў была навернутая ў праваслаўе за два пакаленьні да нараджэньня Кастуся, хаця і захавала багата якія звычаі з часоў да *воссоединения*, здань якога перасьледуе нас і сёньня.

У залежнасьці ад дабрабыту сям'і, на Вігілію падавалі нейкі стабільны, але розны ў розных мясцовасьцях або сем'ях, звычайна ад 7 да 12, лік посных страваў, асноўны комплекс якіх быў адным і тым жа ў сем'ях усіх сацыяльных пластоў, сымбалізуючы еднасьць усіх людзей як дзяцей Божых. Асноўнымі кампанэнтамі вігілійных страваў лічыліся пшаніца, мак і мёд, сымбалі дастатку і пладавітасьці. Галоўнымі стравамі былі куцьця, у гонар якой называлася і ўся вячэра, сыта, аўсяны кісель, узвар з сушаных фруктаў, рыбныя стравы (юшка, селядцы, шчупакі, карп і г.д.), грыбная поліўка або грыбны квас, чырвоны боршч з вушкамі, клёцкі з макам, капуста квашаная або тушаная з грыбамі, ламанцы з макам, сьліжыкі і інш. У заможных дамах традыцыйнымі былі поліўка з мігдалаў, розныя дэсэрты («цукры»), арэхі, віно, з 1830-х г. — гарбата.

Амаль кожная страва традыцыйнага каляднага мэню заслугоўвае сваёй «сагі». Узяць хаця б «грыбны квас», поліўку з хлебнага квасу, грыбоў ды сушанай рыбы, страву, якая зьнікла з мэню зусім, без сантымэнтаў, хай паправіць мяне той, хто такую страву еў. Няўжо гэта быў Колас?

І вось вячэра зачалася!
Спыніцца мушу я на квасе:
Ён колер меў чырванаваты;
Тут быў таран, мянёк пузаты,
Шчупак, лінок, акунь, карась,
Кялбок і ялец, плотка, язь,
Яшчэ засушаныя зь лета.
Але ня ўсё яшчэ і гэта:
Аздоблен квас быў і грыбамі,
Выключна ўсё баравічкамі;
Цыбуля, перчык, ліст бабковы —
Ну, не ўясісь, каб я здаровы!
(«Новая зямля»)

У канцы XIX ст., калі дабрабыт селяніна пасьля двух—трох дзесяцігодзьдзяў цяжкай пасьлярэформавай працы адчувальна вырас, куцьці-панцака пачалі крыху гідзіцца. (У шляхты гэта адбылося яшчэ ў першай палове XIX ст.) На стале яна яшчэ стаяла, старыя заклікалі аддаць належную пашану старому звычаю, але маладое пакаленьне, асабліва дзеці, ледзьледзь «дзяўблі» пару лыжак, бо на стале ж не бракавала куды смачнейшых страваў!

І паступова роля галоўнай каляднай рытуальнай стравы пачала пераходзіць да ламанцаў, або сьліжыкаў, — невялічкага печыва, часам з прэснага, часам з кіслага цеста, якое таксама елі з макавым малаком і мёдам. Адна зь літоўскіх назваў гэтага печыва — «кучукай», нешта накшталт «маленечкіх куцьцеек», што яскрава паказ вае на ролю, якая ім адводзіцца ў сьвяточным мэню. Гэтыя «кучукай», або інакш «сьліжыкай», у сучасных літоўскіх крамах прадаюцца масава, зьяўляючыся недзе за тыдзень да Божага Нараджэньня і імгненна зьнікаючы пасьля сьвята, каб вярнуц-

**Працяг на старонцы 26.**

# Куцьця

Працяг са старонкі 25.

ца толькі праз год. Ці магчыма змусіць да такой жорсткай дысцыпліны, да падтрыманьня гістарычнай памяці, да веры, або хаця б да яе імітацыі сучасных беларускіх вытворцаў і спажыўцоў зь іхным гіпэртрафаваным сялянскім прагматызмам? Куцьця і сьліжыкі, грыбны квас, боршч з вушкамі — гэта не мабільны тэлефон, ня плязма, ня сушы, не фэншуй, не крэдыт на кватэру. Або, зірнуўшы ў зусім недалёкае мінулае, ня чорная скураная куртка і такога ж колеру штаны. Тое, што ў нашых суседзяў жыцьцёвая практыка, у нас — фантастычныя апавяданьні з этнаграфічных даведнікаў, цікавыя толькі жменьцы напаўзвар'яцелых фанатыкаў. Ну, то ізноў пагартаем тыя даведнікі.

Адна зь беларускіх назваў гэтага печыва — ламанцы. Іх робяць з прэснага цеста і ня столькі пякуць, колькі проста падсушваюць у печы, а потым ламаюць (адсюль назва) уздоўж ліній, папярэдне праведзеных на пласьце цеста нажом. Ізноў сьведчыць Коласава «Новая зямля»:

А там ламанцы-праснакі
З пшанічнай добрае мукі;
А макаў сок такі салодкі!
Ламанцы ў ім, ну, як калодкі —
Так добра макам праняліся,
У рот паложыш — абліжыся.

Прэсныя і цьвёрдыя ламанцы, якім смак дадаваў толькі мак і мёд, відаць, былі пачатковай формай стравы, намякаючы на аблаткі. Але адвечнае імкненьне да раскошы і камфорту, якое пранікала і ў сялянскае асяродзьдзе, прымушала і ім шукаць замену, таму і іх пачалі выцясьняць сьліжыкі, салодкае печыва з рошчыннага цеста, у якое мак часам дадавалі пры замешваньні. Калі-некалі недапечаныя сьліжыкі коратка, каля 5 хвілін, адварвалі ў салёнай вадзе, як галушкі, і падавалі палітымі ўсё тымі ж мёдам і макавым малаком. Аднак памятаем, што і прэсныя ламанцы, і салодкія сьліжыкі — варыяцыі на тэму куцьці.

Другая куцьця адзначалася на Сьв.Сільвестра/Сьв.Васіля, у Шчодры вечар, пярэдадзень Новага году, 31 сьнежня (13 студзеня), і называлася шчодрай, тоўстай, багатай, ласай. У гэты вечар падавалі куцьцю з маслам або скваркамі, а таксама мяса — смажанае, варанае і печанае, кілбасы, вяндліну. Сама ж куцьця таксама падавалася на стол з маслам або мясам. Трэцяя куцьця, ізноў посная, з цягам часу атрымала назву Вадзяная, бо прыпадае якраз на пярэдадзень Вадохрышча (у каталікоў — Трох Каралёў). Традыцыйна ўсе тры куцьці варыліся ў адным і тым жа гаршчку, з адной і той жа колькасьці збожжа.

Куцьця. Марозна. Хмурнавата.
Сьняжок падкідвае заўзята;
Сьнег на Куцьцю — грыбы на лета,
Такая матчына прымета,
А сьцежкі чорны — ягад многа;
Ну, і за гэта хвала Богу.

Паглядзім, як будзе. Непазнавальна зьмяніліся і клімат, і звычаі, і сьветапогляд. Ці захаваюцца пры нашым жыцьці сьнег, грыбы, ягады, або і яны падзеляць лёс беларускай куцьці? Хіба што ўмяшаецца Той, на чый успамін мы павінны захоўваць гэты старадаўні звычай...

### Сапраўдная грэцкая «кукія» (сучасны варыянт)

*3/4 шклянкі (120 г) манных крупаў,*
*350 г белага сыру ці тварагу,*
*2 ст. лыжкі мёду,*
*1 яйка.*

Вымачваць манныя крупы ў цеплаватай вадзе 10—15 хв. аб'ёмам дастатковым, каб пакрыць іх цалкам. Калі набрыняюць, адкінуць на друшляк, даць сьцячы вадкасьці, дадаць пакрышаны сыр, мёд і ўзьбітае яйка. Нагрэць, але не даводзіць да кіпеньня.

### Куцьця звычайная (традыцыйная)

*2 шклянкі ячных крупаў,*
*5 шклянак вады,*
*масла паводле густу,*
*соль.*

Перабраць крупы, прамыць, адкінуць на друшляк, даць сьцячы. Заліць вадой у вялікай місе і пакінуць на ноч. Зьліць ваду. Укінуць у рондаль з кіпячай падсоленай вадой і варыць, пакуль крупы не набрыняюць. Зьліць лішнюю ваду. Запякаць у духоўцы пры 160 °C каля 40 хв. Падаваць з маслам, сытой і макавым малаком.

### Макавае малако

*400 г маку,*
*0,5 шклянкі мёду (цукру).*

Насыпаць мак у місу, заліць кіпнем, перамяшаць і пакінуць на 15 хв. Зьліць ваду і зноў заліць кіпнем, перамяшаць і пакінуць на 30 хв., ізноў зьліць. 2—3 разы перамалоць у кухонным камбайне, ужываючы вельмі вострыя нажы, пакуль макавая маса не набудзе крыху белаватага колеру ад соку. Скіпяціць 1,5 л вады і заліць мак, дадаць мёд або цукар і пакінуць у халодным месцы. (Можна таксама дадаць молатых міндалаў, разынак і г.д.)

### Больш выкшталцоная куцьця

*2 шклянкі ячных або пшанічных крупаў (цэлае зерне),*
*1,5 шклянкі маку,*
*1 шклянка цукру,*
*8 лыжак мёду,*
*100 г разынак,*
*100 г лясных арэхаў,*
*100 г цукатаў з цэдры апэльсіну,*
*1 шклянка сьмятаны.*

Старанна прамыць крупы, заліць вадой у рондлі. Давесьці да кіпеньня і варыць на павольным агні 35 — 40 хв., пакуль крупы не набрыняюць.

Насыпаць мак у рондаль, заліць 2 шклянкамі кіпеню, перамяшаць і давесьці да кіпеньня, зьняць з вагню і астудзіць (2—3 гадзіны). Зьліць ваду і перамалоць у кухонным камбайне, дадаць цукар і зноў перамалоць. Зьмяшаць адвараныя крупы, мак, мёд, разынкі, арэхі, цукаты і сьмятану. Астудзіць да пакаёвай тэмпэратуры.

### Ламанцы-праснакі з макавым малаком

*1 ст. лыжка цукру,*
*1 шклянка мукі,*
*2 лыжачкі алею,*
*соль.*

Замясіць крутое цеста: распусьціць цукар у 0,5 шклянкі цеплаватай вады, зьмяшаць з мукой, алеем, дадаць солі, замясіць, дадаючы цеплаватай вады, калі трэба. Раскачаць у квадратны пласт каля 1 см таўшчынёй. Выкласьці на пасыпаную мукой бляху, нарэзаць нажом на паверхні лініі падзелу на 4-сантымэтровыя квадраты або ромбы. Запячы (ці рачэй падсушыць) у духоўцы пры 160 °C, каб цеста набыло залаціста-карычневы колер. За 3 — 4 гадзіны да Вігіліі заліць макавым малаком (гл. рэцэпт вышэй). Падаваць у глыбокіх талерках як суп.

### Сьліжыкі

*1 ст лыжка цукру,*
*15 г дражджэй,*
*2—3 ст. лыжкі малака,*
*1 шклянка мукі,*
*2 лыжачкі маку,*
*панюшка солі.*

Расьцерці дрожджы з 1 лыжачкай цукру, заліць малаком, пасыпаць 2—3 ст. лыжкамі мукі, пакінуць у цёплым месцы на 15 хв., пакуль рошчына не пачне ўздымацца. Рэшту мукі прасеяць, зьмяшаць з рэштай цукру і макам. Дадаць рошчыну, соль і крыху цеплаватай вады. Старанна разьмяшаць, дадаючы вады ў выпадку патрэбы — цеста ня мусіць прыставаць да рук. Закрыць ільняным ручнікам або сурвэткай і пакінуць у цёплым месцы на 20 — 30 хв. Раскачаць цеста ў «ролік» каля 1 — 1,5 см дыямэтрам і нарэзаць на «гузікі» каля 1 см таўшчынёй. Выкласьці на бляху, пасыпаную мукой або змазаную алеем. Запякаць у духоўцы пры 160 °C 10 хв. Падаваць з макавым малаком або з гарбатай/кавай.

Сьліжыкі можна адварыць 5 хв. у падсоленай вадзе як галушкі, зьліць кіпень, заліць халоднай вадой і падаваць палітымі макавым малаком як ламанцы (папярэдні рэцэпт).

# На Каляды ля Катэдры будзе фаервэрк пад музыку Баха

Напярэдадні сьвята Божага Нараджэньня арцыбіскуп Менска–Магілёўскі **Тадэвуш Кандрусевіч** правёў прэс–канфэрэнцыю, якія ўжо становяцца традыцыйнымі.

«Дзякуй СМІ за тое, што вы надаяце так многа ўвагі мне, такому маленькаму чалавеку. Такія сустрэчы патрэбныя як Касьцёлу, так і грамадзкасьці», — пачаў размову Тадэвуш Кандрусевіч.

Пасьля мітрапаліт коротка расказаў, чым займаўся на працягу апошняга месяца.

«Быў у Рыме на кангрэсе, арганізаваным Папскай Радай. Тамсама адбылося маё спатканьне зь дзяржаўным сакратаром Ватыкану Тарчызіё Бэртонэ, ён выказаў пажаданьне ў бліжэйшы час наведаць Беларусь. Пакуль яшчэ ня вызначаныя час і рамкі візыту. Калі такі візыт адбудзецца, то гэта будзе важна, як для Касьцёлу, так і для дзяржавы. Упершыню Беларусь наведае такі высокі чыноўнік з Ватыкану. На першую суботу сакавіка паспрабуем зладзіць тэлемост Менск — Ватыкан. Такое я ўжо рабіў двойчы, калі працаваў у Расеі».

Езьдзіць Тадэвуш Кандрусевіч і па Беларусі. «Нядаўна пабываў у жодзінскай парафіі. Калі я вучыўся ва ўнівэрсытэце, то думаў, што ў Жодзіна ёсьць толькі БелАЗы. Аказалася, што ў гэтым горадзе ёсьць цудоўны касьцёл і багата вернікаў. Прайшоў мой інгрэс і ў Магілёве, бо я адначасова зьяўляюся арцыбіскупам Менска-Магілёўскім. Быў у Бабруйску, тамтэйшы касьцёл я асьвячаў 17 гадоў таму. Сёлета да мяне падышоў двухмэтровы маладзён, напэўна, баскетбаліст, які сказаў, што памятае тое асьвячэньне, ён быў зусім малым. Гэты малады чалавек падужэў ня толькі фізычна, але і духоўна, як і ўмацаваліся ў веры шмат хто зь месьцічаў. На той уік-энд быў у Горадні. Я яшчэ толькі спасьцігаю дыяцэзію, тут для мяне шмат новых задач», — адзначыў мітрапаліт.

Т.Кандрусевіч лічыць, што Касьцёл у Беларусі найперш мусіць быць беларускім, маецца на ўвазе мовы імшы. Разам з тым, ён ня мае нічога супраць, каб некаторыя набажэнствы адбываліся на іншых мовах. Што датычыць Касьцёлу Сьвятога Язэпа, то «гэтае пытаньне ня вырашыць адным махам». Кандрусевіч кажа, што ўздымае гэтае пытаньне на сустрэчах з усімі прадстаўнікамі ўлады.

Перад імшой у ноч на 25 сьнежня перад Катэдральным касьцёлам у Менску будзе фаервэрк у гонар Божага Нараджэньня пад музыку Баха. Гэтую навінку мітрапаліт Кандрусевіч прывёз з Масквы. Трансьляваць сьвяточную імшу з Катэдры будзе Першы нацыянальны канал.

**Зьміцер Панкавец**




**Калядныя сустрэчы Тадэвуша Кандрусевіча зь вернікамі:**

**20 сьнежня** — са сьвятарамі і кансэкраванымі асобамі, якія працуюць у архідыяцэзіі. Архікатэдральны касьцёл, пл. Свабоды, 9. **Пачатак а 11:00.**

**22 сьнежня** — з выкладчыкамі, настаўнікамі і выхавацелямі. Касьцёл Сьвятых Сымона і Алены, вул. Савецкая, 15. **Пачатак а 19:00.**

**22 сьнежня** — з моладзьдзю. Архікатэдральны касьцёл. **Пачатак а 22:00.**

**23 сьнежня** — зь вязьнямі адной зь менскіх турмаў. **Пачатак а 9:00.**

**23 сьнежня** — з мэдычнымі работнікамі. Касьцёл Сьвятога Роха, пр. Незалежнасьці, 44А. **Пачатак а 19:00.**

**27 сьнежня** — зь дзеячамі культуры. Архікатэдральны касьцёл. **Пачатак а 18:30.**

**28 сьнежня** — з хворымі і мэдпэрсаналам. Менскі абласны клінічны шпіталь, пас. Лясны. **Пачатак а 14:00.**

**28 сьнежня** — з малітоўнымі групамі і рэлігійнымі рухамі. Касьцёл Сьвятых Сымона і Алены. **Пачатак а 19:00.**

**29 сьнежня** — зь дзецьмі. Касьцёл Сьвятога Яна Хрысьціцеля, вул. Пляханава, 28–1.

З аншлягам прайшоў у клюбе «Фартуна» ў сталіцы юбілейны канцэрт «Народнага альбому». На фота: сьпявае Вераніка Круглова, якая спэцыяльна для гэтага выступу прыехала з Бэрліна.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Беларускі рок на прафсаюзным радыё**

11 сьнежня на хвалях «Новага радыё» (98,4 FM у Менску) адбылася прэм'ера новай перадачы «Антыпоп». Аўтарка і вядоўца праграмы, вакалістка гуртоў «Тарпач» і «Жыгімонт Ваза» і журналістка «Музыкальной газеты» **Вольга Самусік** кажа: «Гэта зусім не рэфлексія на візыт нашых рокераў да спадара Праляскоўскага. Над перадачай мы пачалі працаваць задоўга да нашумелага дыялёгу». Перадача прысьвечаная беларускаму року ва ўсіх яго праявах і выходзіць штоаўторак ад 23-й гадзіны да апоўначы.

**Паводле «Музыкальной газеты»**

# А.А.Мілн. Віня-Пых

Выйшаў беларускі пераклад кнігі пра дабрадушнага някемлівага Мядзьведзіка.

Ілюстраваная кніга ня толькі пра Віня-Пыха, але і пра Парсючка, Крыштуся Родзьку, Мамантука, Малечу Ру, Восьліка Іа. Дзіцячая клясыка ў своеасаблівым і нават часамі дзёрзкім перакладзе беларускага актывіста з Пазнані.




**А.А. Мілн. Віня-Пых. Пераклад з ангельскай Віталь Воранаў.** [Познань, 2007] Выдавецтва В. Воранава «Белы крумкач». — 128 с.

КАМЭНТАР

## Медзьвядок

Дурнота ў тым, што кніга выйшла гэтак далёка ад патэнцыйных спажыўцоў гэтае прадукцыі. У Беларусі за тыя самыя грошы можна было б выдрукаваць двойчы столькі асобнікаў, дый безь перавозу.

Падаецца, што кніга не прайшла рэдактуры. Ад таго і «мядзьведзіка» ў ёй называюць «медзьвядок», відаць, пад уплывам польскага «медзьвядэк». Рэдактура такой кнігі заняла б пару тыдняў і каштавала б нядорага (думаю, не адмовіліся б ні Садоўскі, ні Шупа, ні Пацюпа), а недаробленая кніга — як недапечаны хлеб сабакам, змарнаваная вялізная праца перакладчыка і друк.

Архіпрынцыповае пытаньне — месца выданьня. Гэта тое, пра што мы ўжо стамляемся гаварыць. Звыклі тое даказваць палякам, а тут, на табе, беларусам... Выдайце вы яе ў Беларусі, і яна дойдзе да большай колькасьці чытачоў. Гэта як у эвангельскай прыпавесьці пра зерне, што ўпала на камень і на добрую глебу.

Нам цяжка меркаваць, чаму выдавалі ў Польшчы. Звычайна гэта адбываецца праз «інтэрас» польскіх дабрадзеяў. Але так быць не павінна. Бываюць розныя выпадкі, розныя ўмовы, можна зразумець. Але факт, што Карлсан патрапіў у кнігарні, а Пых (ці такі Пух) не патрапіць.

Карацей, было б добра дапрацаваць пераклад і перавыдаць у Беларусі.

А Віталю Воранаву за ягонае шчырае сэрца — пашана!

## На польскай мяжы сямігадзінныя чэргі

Перад увядзеньнем дарагіх шэнгенскіх візаў тысячы беларусаў памкнуліся на закупы. Калі на літоўскай мяжы на мінулых выходных стаяць у чарзе трэба было ў сярэднім па тры гадзіны, то ахвотныя трапіць у Польшчу нудзіліся па 5—7 гадзінаў. З 21 сьнежня кошт візы ў новыя краіны шэнгенскай зоны павышаецца да 60 эўра. Прычым толькі для беларусаў: расейцы і ўкраінцы будуць плаціць па 35, паколькі гэтыя дзяржавы не ўступілі ў варажнечу з Эўрасаюзам.

## Грошы за дазвольны штамп вяртаць ня будуць

Дазвольны штмап адменены з 1 студзеня 2008 г. Аднак грошы (35 тысячаў рублёў) АВІРы вяртаць ня будуць тым, хто паставіў яго з запасам.

## Валянцін Бялькевіч падаў дакумэнты на ўкраінскае грамадзянства

Былы паўабаронца кіеўскага «Дынама» і нацыянальнай зборнай Беларусі па футболе Валянцін Бялькевіч падаў дакумэнты на атрыманьне ўкраінскага грамадзянства. Аб гэтым паведаміў прэзыдэнт ФК «Дынама» (Кіеў) Ігар Суркіс. 34-гадовы В.Бялькевіч стаў адным з гульцоў каманды, зь якім ня быў прадоўжаны кантракт. «Асабіста я сказаў яму: Ты разумны хлапец, заканчвай школу трэнэраў, і мы знойдзем табе месца ў клюбе як трэнэру», — адзначыў І.Суркіс.

## Касьціцын-меншы дэбютаваў у НХЛ

Беларускі хакеіст Сяргей Касьціцын дэбютаваў у НХЛ у асноўным складзе «Манрэаль Канадзіенс» (раней ён выступаў за фарм-клюб «Гамільтан Бульдогс» у АХЛ) ды яшчэ ў першым зьвяне з капітанам каманды фінам Саку Койву. Стартавы матч у наймацнейшай лізе плянэты аказаўся пераможным для 20-гадовага нападніка (4:1). Цікава, што другую шайбу ў вароты «Філядэльфіі» закінуў старэйшы брат Сяргея 22-гадовы Андрэй Касьціцын. Цяпер на ягоным рахунку шэсьць дакладных кідкоў і восем выніковых перадачаў. У наступнай гульні з «Таронта» малодшы Касьціцын зарабіў першы бамбардзірскі бал. У гэтай сустрэчы «Манрэаль» зноў перамог.

## На Барысаўшчыне затрымалі партыю гераіну, якой хапіла б на 5000 чалавек

Буйную партыю гераіну затрымалі ў Барысаўскім раёне. Праваахоўнікі адзначаюць, што паўкілеграму наркотыку хапіла б, каб «пасадзіць на іголку» 5 тысячаў чалавек. Кошт партыі, якую везьлі тры чалавекі, ацэньваецца ў 50 тыс. даляраў. Цяпер высьвятляецца паходжаньне наркотыку і месца, куды яго мусілі даставіць.



PHOTO.BYMEDIA.NET

У сталіцы множацца фэстывалі стрыптызу. У адрозьненьне ад сустрэчаў зь пісьменьнікамі і канцэртаў, яны не супярэчаць дзяржаўнай ідэалёгіі. На фота: конкурс стрыптызу «Жар-птушка», 15 сьнежня.

## Махляры зарабілі на інсцэніроўках ДТЗ пад сто мільёнаў

Больш як за два гады чатыром прайдзісьветам разам з неўстаноўленымі пакуль саўдзельнікамі ўдавалася «зарабляць» вялікія грошы на інсцэніроўках дарожна-транспартных здарэньняў.

26-гадовы раней судзімы за крадзеж мянчук, а таксама ягоныя 39-, 32- і 33-гадовыя памагатыя інсцэніравалі ўчыненьне на тэрыторыі сталіцы і Менскай вобласьці 6 дарожна-транспартных здарэньняў і 2 злачынстваў. Махляры разьлічвалі сарваць неблагі «куш» са страхавых арганізацыяў — страхавыя кампэнсацыі па абавязковым страхаваньні грамадзянскай адказнасьці ўладальнікаў транспартных сродкаў і добраахвотным страхаваньні. І да часу гэта сыходзіла ім з рук. Афэрысты нанесьлі страхавым арганізацыям урон на суму больш за 51 млн рублёў і 26 тыс. даляраў ЗША.

**Паводле: «Звязда», Эўрапейскае радыё для Беларусі, ОНТ, «Комсомольская правда» в Белоруссии»**


Танака, дапамажы мне, калі ласка, разьвезьці дзеткам падарункі!
Танака выправіўся ў шлях
Ох, цяжка!
Не хвалюйся, я табе дапамагу!
КапіТан Танака ©
працяг будзе...
http://www.tanakaland.org




## КАНЦЭРТЫ

### Калядны канцэрт

**22 сьнежня ў музычнай гасьцёўні Дома Ваньковічаў (вул. Інтэрнацыянальная, 33а)** — Калядны канцэрт.

### Rasta ў Менску

Гомельская Rasta выступіць у Менску. Гурт у апошні раз адыграе сваю праграму «The Age of Movement». Гэта якраз той альбом, зь якім Rasta атрымала адразу тры ўзнагароды ў роднай краіне – «самы прадавальны альбом у стылі хард-рок/хэві-мэтал», «артыст году ў стылі хард-рок/хэві-мэтал» і Рок-Карону 2006 году. У падтрымку Meridium Tour гамельчукоў зайграе тытуляваны польскі гурт Frontside.

Гурт Rasta — адна з самых неадназначных камандаў нашай сцэны. Ангельскамоўная каманда прадстаўляе Беларусь на найлепшых фэстах цяжкай музыкі.

Таксама ў канцэрце возьме ўдзел малады гурт Ikona. Іх музыка напоўненая дынамічнымі рыфамі і лёгка запамінальнымі мэлёдыямі.

**20 сьнежня. Клюб «Рэактар». 18:00.** Т.: 766-24-25, 649-08-88, 288-61-60.

## ВЫСТАВЫ

### Калядны шопінг у «Падземцы»

**Да 14 сьнежня Арт-галерэя «Падземка» (пр.Незалежнасьці, 43)** запрашае на традыцыйны «Елачны кірмаш 2007». Каралева гэтага сьвята — елка — зьдзівіць і пацешыць Вас нечаканымі выяўленьнямі і формамі. У залях галерэі — працы найлепшых беларускіх мастакоў, дызайнэраў і сяброў галерэі. Вас чакаюць жывапіс, графіка, фатаграфія, кераміка, а таксама самаробныя цацкі і падарункі.

### Калядная бяседа

**23 сьнежня а 17-й у Мастацкім музэі** — адкрыцьцё выставы «Калядная бяседа», на якой можна ўбачыць творы Валер'я Славука (графіка), Ганны Балаш (лялькі), Данілы Парнюка (фота). Як асноўная пазначаная тэма бяседы каралёў (тры асноўныя сымбалічныя пэрсанажы выставы — Кароль, Каралева, Блазан). **Выстава працуе да 11 студзеня.**

### У пошуках ілюзіяў

**Да 21 студзеня ў М-Галерэі інстытуту імя Гётэ (Фрунзэ, 5)** працуе пэрсанальная выстава літоўскага фатографа Томаса Будрыса «У пошуках ілюзіяў».

### Жывапіс і графіка Мсьціслава Дабужынскага

**У Мастацкім музэі да 8 студзеня** працуе выстава жывапісу і графікі Мсьціслава Дабужынскага (1875—1957). Графік і плякатыст, жывапісец і тэатральны мастак, ягонае імя злучана з сусьветнай мастацкай культурай к.XIX— п.XX ст.

## ІМПРЭЗА

### Сустрэча з Алесем Разанавым

Клюб каталіцкай інтэлігенцыі імя сьвятога Кірылы Тураўскага **20 сьнежня** ладзіць сустрэчу з паэтам Алесем Разанавым. Сустрэча адбудзецца **ў доме айца Андрэя Абламейкі (вул. Арджанікідзэ, 6)**. Ехаць да станцыі мэтро «Аўтазаводзкая», ісьці ў той бок вул. Цэнтральнай, дзе насупраць адно аднаго знаходзяцца аддзяленьне сувязі і аптэка.

**Пачатак сустрэчы — 18:30.**

## ТЭАТРЫ

### Купалаўскі тэатар

**23 (ндз)** — «Таполевая завея».
**24 (пн)** — «Вольга».
**26 (ср)** — «Чорная панна Нясьвіжу».
**27 (чц), 28 (пт)** — «Сны аб Беларусі».
**29 (сб)** — «Макбэт».
**30 (ндз)** — «Каханьне ў стылі барока».
*ранішія спэктаклі*
**23 (ндз)** — «Сьнежная каралева».
**29 (сб), 30 (ндз)** — «Афрыка».
*малая сцэна*
**23 (ндз)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха».
**24 (пн)** — «Балядa пра каханьне».

### Тэатар беларускай драматургіі

**21 (пт)** — «Адэль».
**22 (сб)** — «Сёстры Псыхеі».
**23 (ндз)** — «Містэр Розыгрыш».

### Тэатар юнага гледача

**21 (пт), 22 (сб), 23 (ндз), 24 (пн), 25 (аўт), 26 (ср), 27 (чц), 28 (пт), 29 (сб), 30 (ндз)** — «Шчаўкунок».

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Крама цудаў»

Імітацыя Каляднай казкі

**Крама цудаў**
(Mr. Magorium's Wonder Emporium)

ЗША, 2007, **каляровы, 94 хв.**

**Рэжысэр:** Зак Гэлм

**Ролі выконваюць:** Дастын Гофман, Наталі Партман, Джэйсан Бэйтман, Майк Рылба, Джонатан Потс

**Жанр:** Казка

**Адзнака:** 4 (з 10)

Трохсотгадовы ўладальнік чароўнай крамы містэр Магорыюм (Дастын Гофман) мае адысьці ад справаў і пакінуць гэты сьвет. Сваю чароўную краму эксцэнтрычны «імпрэсарыё цацак і аматар абутку» пакідае сваёй касірцы (Наталі Портман), чаму тая супраціўляецца. Але ў кампаніі з занудным бухгальтарам, які паверыць у неймавернае, і 9-гадовага хлопчыка, які знойдзе сяброў, — гераіня прыстасуецца да новай уласнасьці.

Стужка Зака Гэлма, якую наўмысна выпусьцілі пры канцы году — гэта імітацыя Каляднай казкі. У Калядных казках героі — наконадні Раства Хрыстова — рабілі добрыя ўчынкі, дапамагалі нябогам, даравалі крыўды, выпраўлялі жыцьцё і вучыліся любіць сэрцам. У карціне Зака Гэлма няма дабрыні і крыўды, беднасьці і любові. Ёсьць трэнінг для касірак-мэнэджэрак і атракцыёны, атракцыёны.

Хоць Дастын Хофман здольны расквецiць бліскучай акторскай гульнёй і тэлефонную кнігу, лепей не марнаваць грошай — і паказаць сваім дзецям «Іншаплянэтніка» Стывэна Сьпілбэрга. Там дабрыня не падробленая.

**Андрэй Расінскі**

# Куцьця

Ад беларусаў яе пазычылі і літоўцы, і ўсходнія палякі. Піша Алесь Белы. **Старонка 24.**

# Віржынія Шыманец: «Кожная ўлада хоча мець сваю беларускую мову»

Гутарка з сузаснавальніцай асацыяцыі Perspectives Biélorussiennes, доктаркай унівэрсытэту Парыж III, аўтаркай дысэртацыі, прысьвечанай беларускаму тэатру першых дзесяцігодзьдзяў XX ст. **Старонка 20.**

## КАЛІ Б...




**...прыклад найвышэйшай службовай асобы, якая пасьля сэансу лазьні атрымала ад Пуціна ільготы па крэдыту, паўплываў на былых ільготнікаў.**

МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

**Вельмі патрэбна дапамога** дзеля стварэньня файнага краязнаўчага сайту.

Алег. Т.: (029)626–59–96. btclub@tut.by

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

У м. Міры, Навагруд. пав. у адзін кірмашны дзень было такое здарэньне. Адзін мужычок, падвыпіўшы, стаў сьпяваць:

«Расея, Расея, Расея мая!
Бедная, горкая доля твая!»

Сьпевака пачулі стражнікі.

— Свабоды захацеў? — накінуліся яны на мужыка: — Ось мы табе пакажам свабоду!

І праўда, сталі паказваць. А вядома, як паказваюць стражнікі свабоду. Крый Божа бачыць свабоду з паліцэйскіх рук! Але гэтага мала; мужыка пацягнулі да стану, паказваючы дарогаю ўсё тую ж свабоду.

Аб гэтым здарэньні тамтэйшы дантыст расказаў дзьвюм дзяўчатам. Стражнікі падслухалі гэта і павалаклі ўсіх траіх да прыстава. Дзяўчат выпусьцілі, толькі адной далі па патыліцы. Дантыста забралі, і яму многа было клопату, покі ізноў выйшаў на сьвет Божы.

Скора будзе тут суд над стражнікам Саковічам. Ён летась забіў чалавека за тое, што гэты чалавек назваў Саковіча «Белаю паліцыяю». Покі суд ды справа, Саковіч і дагэтуль астаецца на службе. Праўдзіва прыказка:

«Майстар зь Міра — што цяў, то дзіра».

**Т.Барабан**

**«Наша Ніва». №36. 1907**




## А ты падпішыся!

Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву», проста падпішыце дамову. Дэталі — **старонка 17.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### БЕЛАРУСКІ САДОК У ГОРАДНІ

**У Горадні** бацькі дванаццаці дзетак аб'ядналіся для адкрыцьця беларускамоўных групаў у дзіцячых садках. Наша група — гэта беларуская мова і культура выхаваньня, прыязная атмасфэра, шчырасьць выхавацелек і магчымасьць разьвіцьця здольнасьцяў дзіцяці. Нас ужо дванаццаць. Далучайцеся да нас. Мае сыны ўжо там! Для таго, каб далучыцца альбо даведацца болей, тэлефануйце Кузьмінічу Ігару праз тэлефоны: (029)629–92–13, (029)868–98–82 ці лістуйце: ikuzminich@yahoo.com

### БЕЛАРУСКАСЬПЕЎНАЯ СКРЫПКА

**Прымем у падарунак**, возьмем у часовае карыстаньне або нядорага набудзем (або памяняем на коціка!) смык для скрыпкі беларускай. Т.: (029)912–27–30

### КНІГІ

**Набор, рэдагаванне**, інтэрвію, аналітыка, падбор, апрацоўка інфармацыі, матэрыялу, падрыхтоўка рукапісу да друку, пераклад, выдавецкія праекты, распаўсюд. Т.: (029)753–91–96. alesknigi@mail.ru

**Прапаную кнігі** з сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва», Булгакаў «Гісторыя беларускага нацыяналізму» (бел.рус.), Катлярчук «Швэды ў гісторыі Беларусі», Станкевіч «Гістарычныя творы», «За родную мову й праўдзівы назоў», Адамовіч «Да гісторыі беларускай літаратуры», кнігі з сэрыі «Беларускі кнігазбор» (у тым ліку Мальдзіс), многа іншага, дашлю сьпіс прапановаў. Т.: (029)753–91–96. alesknigi@mail.ru

**Іншамоўныя кнігі**: Даведнік па беларусістыцы на ням. мове 1990—2000 (дам пачытаць, скапіраваць), слоўнікі ням–бел–рус, «Незалежная прэса» (рус., бел., англ.), «Гістарычны шлях нацыі і дзяржавы» (англ., бел.), «Курапаты» (англ. бел — адзін асобнік у падарунак) іншае. Т.: (029)753–91–96. alesknigi@mail.ru

**Шукаю** «Беларуская энцыкляпэдыя» т. 1–8, кнігі па гісторыі, краязнаўстве, «Іх імёнамі названыя вуліцы», матэрыялы па ВАВ, СВ. Т.: (029)753–91–96. alesknigi@mail.ru

### ФАРСІ

**Урокі фарсі** і пэрсыдзкага танцу. Зімой вучымся, летам едзем у Іран. Т.: (029)798–03–42

## СУР'ЁЗНА

Да 90-годзьдзя Камітэту дзяржаўнай бясьпекі Беларусі ў будынку КДБ адчыніўся гісторыка-дэманстрацыйны цэнтар. Выстаўленыя экспанаты, прысьвечаныя Дзяржынскаму, асабістыя рэчы Крыстофэра Леца, зьвінавачанага ў шпіянажы, а пасьля памілаванага прэзыдэнтам у дзень інаўгурацыі 2001 г. Гвозд экспазыцыі — дэтэктары хлусьні XV стагодзьдзя (копіі).

Наша Ніва

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф–рэдактар | Андрэй Дынько |
| галоўны рэдактар | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 19.12.2007.

Замова № 6941.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.